Юбілей „Нараўчанак” ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Аліна Дэмбоўская ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 46 (2688) Год LII | Беласток, 18 лістапада 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Узнагароды чатырохкроць

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Як выключэнне чатыры, а не як дасюль тры асобы былі сёлета, ужо восьмы раз, удастоены ўзнагароды маршалка Падляшскага ваяводства ў галіне мастацкай творчасці, распаўсюджвання і захоўвання здабыткаў культуры. Сярод лаўрэатаў апынуліся сусветнавядомы мастак з Валіл Лявон Тарасэвіч ды дырэктар Гайнаўскіх дзён царкоўнай музыкі а. Міхал Негярэвіч.

Дзень да Свята незалежнасці ўрачыстасць у беластоцкім Падляшскім музеі сабрала тлумы. Маршалкоўская ўправа да апошняй хвіліны ў сакрэце трымала прозвішчы лаўрэатаў з групы 28 намінатаў, прапанаваных м.інш. культурнымі і самаўрадавымі ўстановамі, пракансультаваных спецыяльна створаным капітулам і адобраных падляшскай управай. У групе намінаваных былі м.інш. журналістка „Нівы”, ад 13 гадоў рэдактарка „Зоркі” Ганна Кандрацюк-Свярубская і мастак-фатограф Віктар Волкаў. Канчаткова, апрача Лявона Тарасэвіча і а. Міхала Негярэвіча, узнагароды маршалка (статуэтка, ружа і 6 тыс. зл.) трапілі ў рукі пажылой Данаты Гадлеўскай, заслужанай для Ломжынскай зямлі ды Ежы Сьрудкоўскага, 80-гадовага заснавальніка і дырыжора шматлікіх аматарскіх хораў. У кулуарах некаторыя з запрошаных гасцей разважалі, чаму сёлета маршалак Дарыюш Пянткоўскі сваёй узнагародай адзначыў адну асобу больш. Гаварылі, што да групы лаўрэатаў кааптавалі а. Міхала Негярэвіча. У размове з „Нівай” шэф ваяводскага самаўрада тлумачыў:

— Мы палічылі, што а. Негярэвіч варты гэтай узнагароды, а не хацеўшы адымаць узнагарод апошняй тройцы, мы рашылі пашырыць лік лаўрэатаў.

— А хто з членаў управы рэкамендаваў гэту кандыдатуру?

— Член управы Мікалай Яноўскі (на самаўрадавых і апошніх парламенцкіх выбарах балатаваўся ён са спіска ПСЛ у Гайнаўскім павеце — рэд.).

— А як гэта абгрунтоўваў?

— Сказаў, што трэба належна ацаніць уклад а. Негярэвіча ў стварэнне фестывалю Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі, што ад пачатку, калі не было яшчэ двух фестываляў, працуе над яго арганізацыяй і варта ацаніць яго дзеянні звязаныя з тым, што фестываль утрымаўся ўжо столькі гадоў.

Неафіцыйна гаварылася, што прапанова Мікалая Яноўскага мела быць удзячнай адплатай за падтрымку яго на выбарах гайнаўскімі царкоўнымі коламі. Член капітула маршалкоўскай узнагароды Ян Леанчук, дырэктар Падляшскай бібліятэкі, заявіў нам:

фота Мацея Халадоўскага

Злева: Ежы Сьрудкоўскі, Даната Гадлеўская, а. Міхал Негяревіч

— Мы прадставілі толькі спісак кандыдатаў. Перад намі была пастаўлена ўмова, што мае быць трох лаўрэатаў і мы выбралі трох, а маршалак чацвёртую. Аб гэтым рашэнні нас раней не паінфармавалі. Капітул з'яўляецца толькі кансультатыўным органам. Управа ваяводства мае тут вырашальны голас.

www.wrotapodlasia.pl

Лявон Тарасэвіч

На жаль, ва ўрачыстасці не мог прысутнічаць Лявон Тарасэвіч. У той дзень мусіў ён быць у Берліне. Дзень раней у размове з намі мастак сказаў:

— Найбольш прыемна атрымліваць узнагароду ў месцы свайго нараджэння. Я інфармацыю аб прысваенні мне ўзнагароды ўспрыняў з задавальненнем і ў пачуцці прызнання. Я звязаны з гэтай зямлёй, з якой паходжу, жыву і буду жыць.

Лявон Тарасэвіч не скрываў, што факт назначэння яму ўзнагароды маршалка ўспрыняў як ушанаванне ягонай грамадскай дзейнасці, пачынаючы аж з дзевяностых гадоў, калі быў дзеячам Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, якое стварала падмурак дэмакратычнага жыцця, між іншым на тэрыторыі ягонай роднай Гарадоччыны. Мастака з Валіл і прафесара варшаўскай Акадэміі мастацтваў да ўзнагароды прапанавала беластоцкая галерэя „Арсенал”. Ляўдацыю сказала яе куратар Магдаліна Сіверска-Гадлеўская:

— Узнагарода маршалка Падляшскага ваяводства мае асаблівае значэнне, таму, што часта мастакам не даецца адпаведнае прызнанне там, дзе яны жывуць, дарэчы, так як у прыказцы, што цяжка быць прарокам ва ўласнай краіне. Гэта мастак сусветнага класа. Са сваёй вёскі Валілы дайшоў да самых далёкіх і найбольшых галерэй. Ягоныя карціны апынуліся ў найбольш шанаваных калекцыях. Прытым ва ўсіх фрагментах свайго жыцця Лявон Тарасэвіч падкрэсліваў, што паходзіць якраз адсюль. Гэты польскі беларус з'яўляецца амбасадарам нашай зямлі.

У сваю чаргу, прымаючы ўзнагароду „за паслядоўнасць у прапагандаванні царкоўнай музыкі”, а. Міхал Негярэвіч (настаяцель праваслаўнага Свята-Троіцкага прыхода ў Гайнаўцы; афіцыйна заяўлены да ўзнагароды Гайнаўскім старостам) сказаў:

— Маёй мэтай не з'яўляецца дзейнасць дзеля ўзнагарод. Я — святар. А Хрыстос наказвае: будзеце благаслаўнены, калі вас будуць пераследаваць, а не ўзнагароджваць. Прымаю гэтую ўзнагароду з пакорлівасцю.

Пасля ўрачыстасці дайшло да скрыгату паміж святаром-лаўрэатам і журналісткай Радыё „Рацыя” ды нашым журналістам. Папрошаны „Нівай” а. Негярэвіч спачатку прызнаўся, спасылаючыся на існаванне двух фестываляў царкоўнай музыкі (другі арганізуе Мікалай Бушко):

— Мы фестывалю не разбівалі. Мы робім тое, што рабілі ад пачатку. Фестываль нарадзіўся ў Царкве і тут далей арганізуецца.

Журналістка Радыё „Рацыя”:

— Вы лічыце, што гэта Вы...

Айцец М. Негярэвіч:

— Мы нічога не лічым. Вельмі дзякую. З вашым радыё не буду размаўляць.

— ... А з „Нівай”? — спыталіся мы пакорліва.

— Таксама не. Чаму вы ставіце такія дзіўныя пытанні? Дзякую.

Вечар у Падляшскім музеі завяршыўся прыватнымі размовамі пры шыкоўна застаўленым стале.

„Мой адрес — Советский Союз” ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

У Беларусі чарговы раз адсвяткавалі сёмае лістапада. Здаецца, больш ужо ні ў якой краіне дзень вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі не пазначаны ў календары чырвоным колерам. Але ў нас гэта дзяржаўнае свята. І не дзіва. Сімволіка ў нас мала чым адрозніваецца ад сімволікі БССР, эканамічная мадэль яшчэ менш, ну а мадэль улады здаецца не адрозніваецца амаль нічым...

Прыклад з іншых ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Вёска ў пушчы ☞ 5

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Беларуская асвета ... ☞ 8

Ганна КАНДРАЦЮК

Слуцкі паўстанец ☞ I

Сяргей ЧЫГРЫН

9 770546 196000

„Мой адрес — Советский Союз”

У Беларусі чарговы раз адсвяткавалі сёмае лістапада. Здаецца, больш ужо ні ў якой краіне дзень Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі не пазначаны ў календары чырвоным колерам. Але ў нас гэта дзяржаўнае свята. І не дзіва. Сімволіка ў нас мала чым адрозніваецца ад сімволікі БССР, эканамічная мадэль яшчэ менш, ну а мадэль улады здаецца не адрозніваецца амаль нічым. Розніца толькі адна — няма ў канстытуцыі таго знакамітага артыкула, які замацоўваў кіруючую ролю камуністычнай партыі. Ну дык гэта не перашкаджае ўсе іншыя „здабыткі” вялікага кастрычніка выкарыстоўваць на поўніцу. Нібыта і не было тых мільёнаў ахвяр камунізму, бязвінна закатаваных людзей і зламаных лёсаў. Пра іх арганізатары камуністычнага шоу нічога не гавораць. Збіраюцца ў Мінск „партайгеносы” адкуль толькі могуць, ладзяць сабе свята, цешацца, што ёсць яшчэ краіна, дзе можна балявацца на касцях ахвяр савецкіх рэпрэсій.

Паўстаюць новыя помнікі Леніну і іншым „героям” грамадзянскай расправы над уласным народам, старыя помнікі старанна рэстаўруюцца, на тэлебачанні вясёлы канцэрцік пад назвай „Назад у СССР”. Маладыя беларускія спевакі і спявачкі выконваюць папулярныя шлягеры савецкіх часоў. Зразумела, што песні рускамоўныя. Твары выканаўцаў таксама. Толькі пашпарты беларускія. Але гледзячы на іх вясёлы настрой, здаецца, яны хочуць мець іншыя. Чырвоныя і з надпісам СССР.

Былі ў часы Савецкага Саюза і іншыя мелодыі. Дысідэнцкія. Тыя, якія падпольна спявала ўся краіна, марачы вырвацца з-пад апекі „роднай партыі”. Але на беларускім шоу „Прапалі ты мне лазню па-беламу” Уладзіміра Высоцкага зразумела што ніхто не заспяваў. Ды і песні Булата Акуджавы таксама не прагучалі. Не гучалі і рэквіемы памяці па загінуўшых ад радыяцыі людзей, якіх савецкая ўлада выгнала на першамайскую дэманстрацыю адразу пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрычнай станцыі імя Леніна. Не было малебна за здароўе дзяцей, якія і зараз пакутуюць ад наступстваў тае трагедыі. Выканаўцы, у канцы канцэрта, сабраўшыся разам на сцэне, весела дэкларавалі мелодыю БАМаўскай эпохі — „Мой адрес — не дом и не улица, мой адрес — Советский Союз”.

На тым БАМе наўрад ці хто з іх працаваў. Бо не спявалі б зараз з блакітных экранаў на ўсю краіну, грацыёзна скачучы па сцэне, а хадзілі б па ўладных кабінетах і выбівалі б сабе надбаўку да пенсіі за пашкоджанае здароўе і праведзенае жыццё ў халодным бараку, які сапраўды не меў ні нумара, ні вуліцы, і адрас якога быў „Савецкі Саюз”. І не змаглі б тую надбаўку дастаць, бо сацыяльныя льготы з большага адмяняюцца. Праўда, для тых, хто спявае пра Савецкі Саюз ёсць і ганарары, і перспектывы. Усё як і тады, у СССР.

Па традыцыі кіраўнік краіны сёмага лістапада ўдзельнічае ў адкрыцці новых станцый метро. Напярэдадні, кажуць, там быў страшны ажыятаж. Спяшаліся здаць тыя станцыі ў адпаведны тэрмін. Як некалі спяшаліся завершыць працу ўсё над той жа ЧАЭС. Пра гэта прыхільнікі савецкага ладу маўчаць, як і пра тое, што ўвесь Інтэрнэт узарваўся паведамленнямі, што цэнтр беларускай сталіцы выкладзены радыеактыўнай пліткай.

Маўчаць і пра ГУЛАГ, і пра Курапаты, і пра масавыя расстрэлы, і пра знішчэнне беларускай інтэлігенцыі, і пра спробы асіміляцыі (русіфікацыі) беларусаў, і пра забарону веры ў Бога, і пра тое, як народы сацыялістычнай імперыі змагаліся, каб уцячы з „савецкага раю”.

Маўчаць і пра тое, што дзеці былых савецкіх кіраўнікоў чамусьці жывуць не ў краіне, якая тужыць па савецкай сістэме, а дзесьці ў Злучаных Штатах Амерыкі. І перш чым ставіць помнік Іосіфу Сталіну, лепш бы запрасілі са ЗША яго сына, каб растлумачыў чаму ён там, а не ў краіне, дзе ўлада так шануе яго бацьку, што нават „Лінію Сталіна” збудавала.

Маўчаць і пра тое, што рэкламуючы Савецкі Саюз і запрашаючы туды вярнуцца, многія з іх сваіх уласных дзяцей чамусьці адпраўляюць вучыцца і шукаць лепшага лёсу зноў жа на Захад. Туды, дзе ёсць канкрэтны адрас, і вуліца, і дом, а не размытае „мой адрес — Советский Союз”.

Віктар САЗОНАЎ

«Вяртанне» Рышарда Капусцінскага

Зборнік яго вершаў „Вяртанне” нядаўна пабачыў свет у Мінску ў перакладзе на беларускую і рускую мовы. На беларускую мову вершы пераклаў Анатоль Шушко, на рускую — Валеры Грышкавец. Перакладчыкі жывуць у Пінску. Сімвалічна і тое, што ў Пінску ў 1932 годзе нарадзіўся і Рышард Капусцінскі.

Рышард Капусцінскі, як піша ва ўступным слове „Вялікі паляк з Пінска” да кнігі Іна Дзямід, быў самым вядомым, папулярным журналістам і пісьменнікам сучаснай Польшчы. Ён — лепшы польскі журналіст XX стагоддзя, прафесар Варшаўскага і Кракаўскага універсітэтаў, сябра пісьменніцкага ПЭН-клуба, уладальнік прэміі прынца Астурыйскага „За творчасць, якая садзейнічае збліжэнню розных народаў і культур”, два разы вылучаўся на Нобелеўскую прэмію.

На Захадзе ў кожнай кніжнай краме на вітрыне пачэснае месца сярод іншых літаратурных навінак Еўропы і Амерыкі можна ўбачыць выданні Рышарда Капусцінскага. Яго артыкулы і матэрыялы аб ім — на першых старонках многіх газет, часопісаў, тэлебачання і радыё.

Так атрымалася, што, будучы сваім сярод сусветнай творчай эліты, наш зямляк Капусцінскі, на вялікі жаль, зусім невядомы на Беларусі. Толькі цяпер, пасля смерці, ён асобным выданнем упершыню вяртаецца да беларускага чытача. Асобныя творы польскага паэта сяды-тады перакладаліся на беларускую мову. Напрыклад, у двухтомніку анталогіі польскай паэзіі XX стагоддзя „Напярэймы: ад Буга да Варты” (Мінск 2003) у перакладзе Алега Лойкі ёсць два вершы Рышарда Капусцінскага.

Рышард Капусцінскі ніколі не цураўся сваіх палескіх каранёў, быў рады любой сустрэчы з землякамі. Бацькі будучага журналіста і паэта ў 30-я гады мінулага стагоддзя працавалі настаўнікамі ў Пінску. Тут захаваўся будынак, у якім да другой сусветнай вайны знаходзілася польская школа № 5, дзе настаўнікам прыродазнаўства працаваў ягоны бацька Юзэф Капусцінскі. У гэтай школе ў першым класе вучыўся і Рышард. Маці яго — Марыя Капусцінская (Бабко), скончыла польскую настаўніцкую семінарыю. Спачатку настаўнічала ў Лунінецкім павеце на Брэстчыне, а пасля замужжа — у польскай школе № 1 Пінска. Тут, у горадзе над Пінай, Марыя і Юзэф знайшлі сваё сямейнае шчасце. 4 сакавіка 1932 года ў іх сям'і нарадзіўся Рышард, а праз год — Барбара...

У зборнік „Вяртанне” ўвайшлі 48 вершаў-верлібраў паэта. І бачыць верлібр польскага паэта, як дзіўнага госця на нашай зямлі, нельга. Бо і ў нас столькі правоў на верлібр, колькі ў любой іншай мове, а тым больш у мове нашых суседзяў.

Чытаючы кнігу „Вяртанне”, кранае сэрца верш „Два паэты”. Над радкамі-роздумамі ёсць нам над чым задумацца:

Якія цудоўныя вершы былі ў іх
у гэтых састарэлых спадароў
пана Яраслава Івашкевіча
і пана Адама Важыка
бачу сёння
крочаць Вейскай вуліцай
пан Яраслаў абапіраецца на кульбаку
пан Адам напалову згорблены
а у суседнім парку
спяваюць птушкі.

Птушкі спявалі і тады калі Яраслаў Івашкевіч (1894-1980) і Адам Важык (1905-1982) былі маладымі, тады, калі і яны спявалі, як птушкі. Гады бяруць сваё, а паэзія, як і спевы птушак, неўміручая. Яраслаў Івашкевіч — быў шчырым сябрам беларускіх літаратараў. Вельмі часта перакладаўся на беларускую мову, ды і цяпер перакладаецца. Той жа Алег Лойка 14 вершаў Івашкевіча пераклаў і ўключыў у „Анталогію польскай паэзіі XX стагоддзя”. Вершы яго на беларускую мову таксама перакладалі Анатоль Вялюгін, Міхась Машара, Язэп Семяжон, Максім Танк, а прозу — Янка Брыль, сябар пана Івашкевіча. Трохі менш перакладаўся Адам Важык, але і яго паэтычнае слова па-ранейшаму гучыць па-беларуску. Добрая падборка Важыка змешчана ў „Анталогіі...” Алега Лойкі. Гэта былі два выдатныя польскія паэты, пра якіх невыпадкова згадаў Рышард Капусцінскі. Той вялікі Рышард Капусцінскі, пра якога лаўрэат Нобелеўскай прэміі Віслава Шымборская сказала: „Са шчырай удзячнасцю думаю пра кнігі, якія ён напісаў, і з глыбокім жалем пра кнігі, якія напісаць ужо не зможа. Вялікі пісьменнік, высакародны чалавек, нястомны даследчык нашага чароўнага, але вечна трывожнага свету. Гэта — асоба, для якой усе далягляды былі цеснымі і існавалі толькі для таго, каб іх пераадольваць думкаю, сэрцам, творчасцю”. І мне толькі застаецца пагадзіцца з гэтымі думкамі і сказаць словы падзякі тым, хто вярнуў творчасць Рышарда Капусцінскага на Беларусь.

Сяргей ЧЫГРЫН

Вачыма еўрапейца

З клопатам аб сваіх

Зараз жа перад адыходам ПіСаўскі ўрад адобрыў на адным са сваіх пасяджэнняў інфармацыю на тэму сітуацыі польскіх нацыянальных меншасцей і ступені выконвання іх правоў у іншых краінах. Хацелася б сказаць: лепш позна, чым зусім. Таксама як было з прынятай у апошнюю хвіліну парламентам ужо папярэдняга склікання Картай паляка. Са сціплых інфармацый, якія перадала міністр замежных спраў Анна Фатыга, ды з камюніке Інфармацыйнага цэнтра ўрада (ІЦУ) вынікае, што бяльмом на воку для адыходзячай выканаўчай улады было пытанне польскай меншасці ў Нямеччыне. Міністр Фатыга палічыла прагрэс у захоўванні яе правоў „недастатковым”. З яе выказвання цяжка было аднак дайсці да высновы як яна разумее паняцце меншасці; ці гаворка тут пра польскія сем'і, пражываючыя ад стагоддзяў на тэрыторыі Нямеччыны ў сённяшніх яе межах, ці пра палякаў па паходжанні, якія выехалі туды ў апошнія, пасляваенныя дзесяцігоддзі, між іншым у 1960-1970-х гадах і пасля 1980 года ў былую ФРГ і пазней у задзіночаную Нямеччыну пасля развалу Берлінскага муру, значыць, у сапраўднасці пра эмігрантаў. Мабыць, гэтыя цяжкасці ў нейкі спосаб спалучаюцца з фактам — на што, дарэчы, звярнула ўвагу МЗС у Варшаве — што Берлін не прызнае статусу польскай меншасці. Дарэчы, такія цяжкасці ў адрозніванні сваіх грамадзян іншай нацыянальнасці і эмігрантаў мае таксама шмат г.зв. звычайных палякаў, асабліва наконт беларусаў і ўкраінцаў. Я не раз чуў ад польскіх паланафілаў пра тутэйшых беларусаў пасля таго, як тыя спрабавалі ўзяць голас у публічных справах або абараняць уласныя грамадзянскія правы: „Калі ім не падабаецца, хай вяртаюцца да сябе, на Беларусь!”

Наколькі аднак для адыходзячага ўрада праблемы з адрозніваннем даялцінскай аўтахтоннасці і пазнейшай эміграцыйнасці палякаў здаюцца быць праблемай адно Нямеччыне, то ў адносінах да палякаў, пражываючых у Беларусі ці Літве, пытання такога няма. Вядома, хоць бы таму, што польская эміграцыя ва ўсходнім напрамку не была з'явай, думаю, што прынамсі ў двух-трох апошніх пакаленнях. Калі гаворка аб Беларусі, то ў камюніке ІЦУ можна прачытаць: „Найгорш ацэнена сітуацыя польскай меншасці на Беларусі, асабліва ў кантэксце дэлегалізацыі Саюза палякаў на Беларусі і дзеянняў рэпрэсіўнага характару ўрада Аляксандра Лукашэнкі”. Тут варта звярнуць увагу на тое, што ўспамінаючы аб Нямеччыне міністр Фатыга адзначыла: „У навучанні польскай мовы ў апошні час прыкмячаецца рэгрэс”. Не ўспамінае спадарыня міністр, як з гэтым навучаннем польскай мовы ёсць якраз у Беларусі. Здаецца мне, што лепш там з польскай мовай, чым з беларускай. Гэта, вядома, не змяняе факту, што рэжым Лукашэнкі вядзе рэпрэсіўную палітыку ў адносінах да СПБ. Тут можна, аднак, паставіць пытанне, што фактычна зрабіла польскае МЗС на міжнароднай арэне, каб не трэба было даходзіць да такіх высноў. Ці было яно ў гэтым кантэксце неэфектыўным?

У заяве міністр замежных спраў і камюніке ІЦУ я знайшоў інфармацыю на тэму польскай меншасці ў Латвіі, у Казахстане ці ў суседніх краінах. Слова там аднак няма на тэму захоўвання іх правоў ва Украіне і Славакіі. Не мог я зразумець чаму. Аднак добра, што лепш позна, чым зусім, адыходзячы ўрад заняўся праблематыкай, якую акрэслівае Карта асноўных правоў Еўрасаюза ў раздзеле „Роўнасць”: „Забараняецца любая дыскрымінацыя асабліва па прычыне (...) прыналежнасці да нацыянальнай меншасці”.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

„Нараўчанкі” юбілейныя

Міра ЛУКША

Колькі гадоў народнаму калектыву „Нараўчанкі”? Ці 20, ці мо ўжо 29? Ці лічыць назву ад хрысцін гурту з Нараўчаншчыны, якія ніколі не адбыліся? Бо сябры і сяброўкі народнага гурту з Нараўкі — не адно з самога гміннага мястэчка. Рэй вядуць тут, напрыклад, кабеты з Альхоўкі, і калісьці з моцным прытупам граў на гармоніку ў ім Мікалай Варанецкі, настаўнік, паэт і альхоўскі ніўскі карэспандэнт. І Оля Савіцкая едзе сюды з Елянкі. І з Гайнаўкі на рэпетыцыю прыязджаюць таксама, праўда, ужо не на веласіпедах. На веласіпедах прыязджае таксама цэлае абсталяванне для тэатралізаваных прадстаўленняў абрадавых сцэнак, і народныя строі, з прасамі, каб на сцэне паказацца ціп-топ. Бо ж гэта візітная картка ўсяе Нараўчаншчыны! — з гонарам сказаў на юбілейнай сустрэчы з нагоды дваццацігоддзя (10 лістапада) войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

Вельмі рады былі цяперашнія і былыя члены калектыву ўшанаваннем сваёй руплівай дзейнасці — урачыстасць сабрала паўнюткую залу (у святліцы керамічнай фобрыкі ў Ляўкове-Старым, вялікім доме культуры) гасцей — і ўлад самаўрадавых і чыноўнікаў, і прыхільнікаў культуры, і сяброў іншых калектываў і цэнтраў культуры Беласточчыны. Былі аграмадныя букеты кветак, падарункі, цёплыя словы ўдзячнасці і ім, і людзям, якія не шкадавалі часу і сэрца для падтрымкі самадзейнікаў на іх некароткім творчым шляху, як Сцяпану Копу. І ўспаміны — пра звычайнае старанне спявачак і іх сяброў у збіранні і рыхтаванні фальклору, пра выступленні не толькі на тутэйшай тэрыторыі, але і шырэй, разам з часам забаўнымі прыгодамі, як у Раўбецку ў Беларусі, куды, між іншым, даехалі „Нараўчанкі” з роднай песняй і абрадам.

— У гісторыі гэтага калектыву трэба было б вылучыць тры этапы, — пералічала Ядвіга Карпюк, вядучая мерапрыемства пажылая нараўчанская настаўніца, грамадская дзяячка, — і знамянальныя для гэтых перыядаў даты. Пачаткі дзейнасці калектыву сягаюць 1978 года. Быў снежань, калі спадарыня Оля Закройшчык, кіраўнічка Гміннага дома культуры ў Нараўцы, беручы прыклад з таго, што ў Ляўкове існаваў ужо два гады калектыў пры керамічным заводзе, пастаралася заснаваць такі гурт і ў Нараўцы, па ініцыятыве гуртка вясковых гаспадынь. Музычным інструктарам стала тады Марыя Смактуновіч, маладая настаўніца нараўчанскай школы. Першы склад ўтрымаўся пару гадоў. Наступная дата гэта 1985 год, калі гурт адрадзіўся, у вельмі амалоджаным складзе, са спявачкамі поўнымі энергіі, запалу і красы. Гэта былі Аля Рубчэўская, Люцына Місяюк, Алена Казёл, Валя Панкоўская, Зіна Пацэвіч, Оля Закройшчык. Адразу сягнулі па поспех — здабылі трэцяе месца ў аглядзе беларускай песні. Наступны поспех калектыў меў у 1980 годзе — заняў тады там другое месца. Чарговыя поспехі былі ў 1995 г., ды паступова склад гурту змяняўся.

фота Міры Лукшы

„Нараўчанкі” з інструктарам Пятром Скепкам

У калектыў дайшлі Тамара Адамовіч, Зіна Каліноўская. Трэці перыяд дзейнасці — 1997 год. У гэтым годзе наступіла чарговая змена ў складзе калектыву. У гэтым складзе, з нейкімі зменамі, трымаецца ён дагэтуль. Вось пані Оля Сачко і Жэня Вярбіцкая з Альхоўкі — вельмі актыўныя сяброўкі гурту, якія ў сувязі з рэпетыцыямі і выездамі на выступленні і далей ці бліжэй дабіраюцца на сваім ровары. Відаць, гэтая трэніроўка добра ім служыць! Колькі тут усмешкі і маладосці! І гэты ровар вязе не адно іх дзве, але і рэквізіты для сцэнак — дываны, кілімы, прасы, і церніцы, і качалкі... Жэня Вярбіцкая — вельмі вясёлы чалавек. Наракае, што баляць ужо ёй ногі, дык хай толькі музыка зайграе! І пані Жэня можа танцаваць да рання! Пані Люба Трусевіч — гаспадарчы кіраўнік калектыву — дбае і пра добры настрой каляжанак, і аб кулінарныя справы, і пры сабе мае вязку ключоў у гмінны цэнтр культуры, дзе адбываюцца сустрэчы калектыву. Пані Аня Карэтка — жыве ўжо пару гадоў у Гайнаўцы, салістка. Каля яе ў гурце — дачка, Беата. Кіраўніком гурту па арганізацыйных справах з'яўляецца Оля Савіцкая, родам з Елянкі, характэрны знак: ровар, на якім прыязджае на рэпетыцыі, мае вялізнае люстэрка. Пані Оля — душа калектыву, хуткая і да жартаў, і да сур'ёзных рэчаў. Ёсць таксама спявачкі, якія нядаўна ў складзе калектыву — Оля Раманчук ад двух гадоў, Люба Домб (вярнулася, бо няма лепш, чым „Нараўчанкі”!). Ёсць яшчэ Зіна Пацэвіч, якая цяпер па іншых прычынах не можа выступаць, заўзятая танцорка „Лявоніхі”. У Гайнаўцы пражывае Пятро Скепка, інструктар ад 2002 года. Раней гурту памагаў Анатоль Куніцкі з Гродна. А раней не шкадаваў высілку і сэрца Сцяпан Копа, які заўжды быў напагатове, на кожны заклік самадзейніц, з вялікай торбай поўнай адпаведных матэрыялаў, як і па ўсёй Беласточчыне, імчаўся ў Нараўку. Вельмі дзякавалі ў гэты дзень былыя і цяпершнія „нараўчаначкі” Сцяпану Копу (бараніўся: „Што вы, я ж не член «Нараўчанак», гэта ж не маё дваццацігоддзе!”), і дзякавалі ягонай жонцы Ані за тое, што пускала яго ў любы час на падтрымку роднай песні і родных яе ўлюбёнцаў. У гурце былі таксама Жора Бароўскі з Заблоччыны, Антон Леўша з мандалінай са сваёй Зосяй, Насця Пракапчук, якая найлепш прэзентавалася ў беларускім строі „Нараўчанак”, якую найахвотней фатаграфавалі турысты. Найдаўжэй у гурце — Зіна Пацэвіч, з 1985 года, і Оля Савіцкая.

фота Міры Лукшы

Оля Савіцкая з караваем ад беларускага консульства з Беластока

Успамінам пра першых і цяперашніх „Нараўчанак” быў таксама фільм Барбары Кшыжанскай, які яшчэ раз паказаў Тадэвуш Кшыжанскі, кінематаграфіст з Кракава, які выбраў на месца жыхарства Альхоўку ў Нараўчанскай гміне. Да славы „Нараўчанак” даклаўся і Янка Казёл, цяпер варшавяк, які на аўкцыёне купіў новы акардэон (які належаў славутаму Стаху Вялянку) і прывёз яго ім на паратунак. Бо як было са старым гмінным гармонікам, за ўсе гады (каля 30!) дакладна „зайграным”? Успамінае, пад уцеху публікі, Оля Савіцкая: „Прыйшоў Пятро і кажа: Як будзем іграць? Клавішы паадпадалі! Клеіў. Клей заўжды браў з сабою. Едзем на выступленні ў Семяноўку — як Пятро бас прыціснуў, той бас пачаў гудзець адно па-свойму. Таўчэ Пятро акардэон, а той бас — сваё. Трэба будзе браць яго на клей, і награваць! Ставілі мы яго на радыятар, каб ссохся. Паедзем зноў куды — зноўку не іграе! І калі Янка падараваў нам акардэон — ну, я не знаюся ні на марках, ні на масцях, і не іграла ніколі на акардэоне — дык ён вельмі цяжкі, а Пятро кажа, што надта ж лёгка ён ходзіць!”

Выступленні „Нараўчанак” здобяць усе ўрачыстасці і святы ў Нараўчанскай гміне. Ахвотна ўдзельнічаюць яны ва ўсіх фестывалях і фэстах Беласточчыны, запрашаюцца на розныя мерапрыемствы, якія нясуць прамоцыю іхняй гміне. Выступаюць таксама на паказах і ў іншых гмінах Гайнаўшчыны, за мяжой, у цэнтрах культуры, з якімі сябруюць, як прадстаўніцы, што кожны раз падкрэсліваюць, жывой беларушчыны. На кабетах жыве Беларусь! І зусім ім не да ўзнагарод (хоць гэта прыемна!), а мара ў іх адна: здароўя каб хапіла як даўжэй, сілы націскаць на педалі, і каб павялічыўся рад на канцэрце. І каб хоць раз выступіць на гала-канцэрце фестывалю беларускай песні, бо хоць „Нараўчанкі” перамагалі або былі ў ліку лепшых, уздыхаюць: ніколі... „пані Валя нас не запрасіла”!

фота Міры Лукшы

Сцяпан Копа паспяваў даязджаць і да Нараўкі. Разам з ім (злева направа) Валянціна Панкоўская, жонка Анна і Ала Кабац

Выбарчая адгалоска

Хаця парламенцкія выбары ўжо за намі, аднак у памяці ўсё яшчэ жывая перадвыбарчая мітусня, намаганні і захады кандыдатаў у паслы атрымаць усенародную падтрымку. Перада мною ляжыць лістоўка Мікалая Яноўскага, у якой заяўлена, што ягоную кандыдатуру падтрымліваюць кіраўнікі мясцовых самаўрадаў — бурмістры і войты (разам 17 асоб). Падумалася мне: „Кандыдат падрыхтаваў сабе левае плячо, лічыў, што іхны аўтарытэт дапаможа схіліць грамадства прагаласаваць за яго на выбарчых участках". Аказалася зусім інакш. Не стала правага пляча — народа. Сёння людзі ўжо не тыя, іх цяжка абдурыць спрытнымі лозунгамі на лістоўках.

У 44 нумары „Нівы" Мікалай Яноўскі сказаў: „Мой вынік вельмі слабы. Тлумачу гэта фактам, што была нізкая прысутнасць. Не ўмелі мы пераканаць усіх беларусаў, каб пайшлі на выбары". На каго ж тады наракае былы кандыдат у дэпутаты? Відаць, справу ў гарадах завалілі бурмістры, а ў гмінах — войты. Самога надрукавання на лістоўцы прозвішчаў 17 самаўрадавых дзеячаў, падтрымліваючых кандыдатуру, замала. Камусьці трэба было яшчэ дайсці да солтысаў, да паасобных сялян з прапановай падтрымаць кандыдатуру. Сёння члену ўправы ваяводства Мікалаю Яноўскаму трэба разлічваць толькі на сябе, аглядацца вакол сябе і моцна трымацца крэсла, на якім пакуль што сядзіць. Пакуль што.

Дзед ДАНІЛА

Солтыс Галіна Вярхоўская

Новаабраная ў студзені г.г. солтыс Заблотчыны (Нараўчанская гміна) Галіна Вярхоўская шмат што робіць для дабра ды выгаднейшага жыцця аднавяскоўцаў. У мясцовай святлівы арганізавала сустрэчу, м.інш., з нагоды Дня жанчын, у якой прысутнічалі кабеты з Заблотчыны і суседняй Мінкоўкі (гэта адно салэцтва). І зараз яны пачалі часцей сустракацца, каб пагутарыць з сабой, адчуць сябе згуртаванымі. Гэта цяпер вельмі важнае для ўдоваў і ўдаўцоў ды ўсіх іншых старэйшых асоб.

Солтыс Галіна Вярхоўская зрабіла захады дзеля разбудовы заблотчанскай святліцы ды добраўпарадкавання пляцоўкі ля яе. У ліпені г.г. супольнымі намаганнямі пабудавалі і абсталявалі спартыўную пляцоўку для моладзі. Дапамагалі ў гэтым войт Нараўчанскай гміны, Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы і дырэктар Гайнаўскага дома культуры Андрэй Скепка (вялікі любіцель спорту). На пляцоўцы летам адбываліся спаборніцтвы моладзі з Заблотчыны і Свінароя.

За святліцай выбралі месца для распальвання кастра. Тут пабудавалі лавачкі і стол. Дапамог ляснічы Надляснічтва Броўск Уладыслаў Радзіванюк (ён і радны Рады гміны). Сустрэчу ля кастра арганізавалі 21 ліпеня г.г. Сабралася 40 маладых і старэйшых асоб. Паплылі цікавыя расказы-ўспаміны, прыпякалі кілбаскі на вогнішчы, частаваліся.

Варта адзначыць, што спадарыня Галіна Вярхоўская дае аднасяльчанам добры прыклад. Яна заняла другое месца ў конкурсе „На найпрыгажэйшую сялянскую сядзібу".

(ян)

Узяць нам прыклад з іншых

Аляксей МАРОЗ

(працяг з 45 н-ра)

Прапановы для нацменаў — медыйная тэма

Хаця жыхары гміны Тарнаў-Апольскі рэдка карыстаюцца прывілеяй дапаможнай мовы, тамашнія людзі лічаць, што яе ўвядзенне было патрэбнае.

— Раз у месяц здараецца, калі нехта рашаецца нешта афарміць у гміннай установе па-нямецку і найчасцей у вуснай форме. Аднак у нас прынамсі 30% работнікаў гміны добра ведае нямецкую мову і можа афарміць усе справы па-нямецку, а чарговыя 30% патрапіць прынамсі дагаварыцца па-нямецку, — гаворыць войт Зыгмунт Ціхань, які лічыць, што ўвядзенне дапаможнай нямецкай мовы патрэбнае для ўшанавання нацыянальнай меншасці ў гміне. — Калі ў час апошняга перапісу акрэсленая група насельніцтва назвала сябе немцамі (звыш 30% у гміне Тарнаў-Апольскі) і яны адчуваюць сябе людзьмі гэтай нацыянальнасці, выпадае ўшанаваць іх волю. Хаця гэта ад радных нямецкай нацыянальнасці выходзілі прапановы змен, у нашай радзе ўсе аднадушна прынялі пастанову аб двухмоўных указальніках (таксама і радныя польскай нацыянальнасці). У нас няма варожасці паміж польскай і нямецкай супольнасцямі і не было ніякіх вестак, што польскае насельніцтва выступае супраць нашых прапаноў. Указальнікі з надпісамі па-нямецку гэта медыйная тэма і хіба няма месяца, а часам нават і тыдня, калі не гавораць аб новых прапановах для нацыянальнай меншасці. Мясцовым палякам новыя змены не перашкаджаюць, а немцы адчуваюць, што гэта ім патрэбнае. Двухмоўныя назвы на ўказальніках патрэбныя для паказання, што тут жыве нацыянальная меншасць, якая спасылаецца на сваю нацыянальнасць і карані. Не чуў я, каб нехта адмоўна выказваўся аб прапанове ўвядзення двухмоўных указальнікаў і гэта нікому не перашкаджае. Еўропа яднаецца, межы знікаюць, нашы людзі ездзяць па еўрапейскіх краінах і бачаць, што там, дзе жывуць нацыянальныя меншасці, уводзяцца двухмоўныя назвы мясцовасцей.

У гміне Радлаў, дзе каля 28% жыхароў у час перапісу насельніцтва заявіла пра сваю нямецкую нацыянальнасць, даўно ўведзена дапаможная нямецкая мова і пасля грамадскіх кансультацый радныя прынялі пастанову аб двухмоўных дарожных указальніках (па-польску і па-нямецку).

— Мы прайшлі ўсю працэдуру, атрымалі згоду ваяводы і чакаем адказу Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, каб атрымаць таксама сродкі на змену дарожных указальнікаў. Кансультацыі ў нас праводзіліся на вясковых сходах, якія традыцыйна арганізуем са студзеня па сакавік. Пасля ініцыятыўная група хадзіла таксама па хатах і людзі маглі выказацца за новыя ўказальнікі або супраць іх, бо для часткі людзей было без розніцы, ці будуць новыя ўказальнікі, — расказвае войт гміны Радлаў Владзімеж Керат. — Маюцца юрыдычныя інтэрпрэтацыі новага закону аб нацыянальных меншасцях, якія гавораць, што неабавязкова праводзіць кансультацыі. Мы, аднак, правялі размовы з грамадствам, каб лепш паінфармаваць яго аб новых прапановах. Калі б быў вялікі супраціў, мы б не ўводзілі новых указальнікаў. У час кансультацый з грамадствам аказалася, што 80% апытаных было за ўстанаўленне новых указальнікаў і будзем іх мяняць ва ўсіх вёсках нашай невялікай гміны.

Войт Владзімеж Керат паінфармаваў, што ў Радлаўскай гміне жыхары рэдка карыстаюцца нямецкай мовай у якасці дапаможнай.

— Увядзенне нямецкай дапаможнай мовы было сімвалам і ўшанаваннем нацыянальнай меншасці, — заяўляе войт Владзімеж Керат. — Я гаварыў, што трэба ўшанаваць гісторыю і няма чаго ні саромецца, ні баяцца, толькі трэба паказваць назвы мясцовасцей па-нямецку і на

Як відаць гмінныя ўлады на Апольшчыне шануюць таксама і гісторыю

ўказальніках. У нашай гміне амаль усе радныя выказаліся за прыняцце пастановы аб новых указальніках, толькі двух радных устрымалася ад галасавання.

Аказваецца, што на Апольшчыне ў многіх гмінах ставяць двухмоўныя ўказальнікі.

— Я думаю, што ў Апольскім павеце будзе прынамсі 10 гмін, якія ўвядуць двухмоўныя ўказальнікі. На 13 гмін Апольскага павета толькі ў 2 гмінах менш чым 20% жыхароў назвала сябе немцамі ў час перапісу, а ў гміне Папелюў паставілі двухмоўныя ўказальнікі яшчэ да прыняцця Сеймам закону. Жыхары гэтай гміны смяюцца з нас, што мы патрабуем юрыдычных вырашэнняў, а яны дзесяць гадоў таму паставілі такія ўказальнікі і яны стаяць да гэтай пары, — інфармуе войт гміны Тарнаў-Апольскі Зыгмунт Ціхань. — Цяпер у рэестр МУСіА занесены 16 гмін з дапаможнай нямецкай мовай. Я думаю, што такіх гмін будзе яшчэ больш. У Крапкавіцкім павеце таксама ёсць гміны, дзе жыве нямецкая меншасць і там таксама будуць ставіць двухмоўныя ўказальнікі. Лічу, што ў Стшалецкім павеце большасць гмін, а можа нават усе, будуць мець новыя ўказальнікі. Нават улады Стшалецкага павета павесілі двухмоўныя дошкі на сваім будынку.

Патрэбны інфармацыйныя сустрэчы

Паспрабаваў я яшчэ скантактавацца з Падляшскім ваяводам Богданам Пашкоўскім і даведацца якія ваяводская адміністрацыя прымала меры, каб нашым радным прыблізіць магчымасці выкарыстання на практыцы закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях і рэгіянальнай мове, прынятага 6 студзеня 2005 года і што ў гэтай справе хоча рабіць у будучыні. Ад прэс-сакратара ваяводы Міраслава Пянткоўскага атрымаў я інфармацыю пра сустрэчу з прадстаўнікамі арганізацый нацыянальных і этнічных меншасцей, наладжаную дзяржаўнымі структурамі ў пачатку гэтага года, у якой прымалі ўдзел таксама бурмістры і войты. Гутарка мела ў галоўным тычыцца польскіх законаў у адносінах да нацыянальных і этнічных меншасцей. Не атрымаў я звестак, каб ладзіліся спатканні з раднымі, якія аб згаданым законе часта даведваліся ад войтаў або масмедыяў. Аказваецца, нашы радныя недастаткова зарыентаваныя ў справе магчымасцей увядзення дапаможнай беларускай мовы і размяшчэння двухмоўных указальнікаў. Добра было б, каб дзяржаўная адміністрацыя ладзіла сустрэчы з дэпутатамі ў тых гмінах, дзе кампактна жывуць беларусы і пазнаёміла іх з магчымасцямі, якімі могуць карыстацца нацыянальныя меншасці.

Як будзе ў Гайнаўцы і іншых нашых гмінах?

Гайнаўскія радныя ад Беларускага народнага выбарчага камітэта выступілі з прапановай увядзення двухмоўных (на польскай і беларускай мовах) назваў горада на ўказальніках, размешчаных на яго акраінах (раней гайнаўскія радныя прынялі пастанову аб увядзенні беларускай мовы ў якасці дапаможнай у кантактах з работнікамі гміннага самаўрада). Цяпер ад большасці гарадскіх радных будзе залежаць лёс прапановы дэпутатаў ад БНВК. Калі яна не будзе адкінута, радным прыйдзецца вырашыць ці хочуць галасаваць за праект у справе ўказальнікаў пасля апытання грамадства, ці хочуць пакарыстацца дарогай, якую праклалі радныя гміны Тарнаў-Апольскі (без кансультацый), калі МУСіА пісьмова зацвердзіць прапанову з Апольшчыны. Цяжка зараз прадбачыць фінал прапановы гайнаўскіх радных ад БНВК, але можна ж памарыць і ўявіць сабе, што распачынаецца сесія Рады горада Гайнаўкі і прэзентуецца праект увядзення двухмоўных указальнікаў і ўсе радныя галасуюць за ім, так як гэта зрабілі радныя гміны Тарнаў-Апольскі. Ніхто з радных не галасуе супраць пастановы, каб паказаць, што шануе беларускую нацыянальную меншасць, пражываючую ў Гайнаўцы, і яе мову. Пасля радныя ў згодзе і з усмешкамі на тварах разыходзяцца дамоў, а ў мясцовай польскамоўнай прэсе паяўляюцца артыкулы, у якіх журналісты хваляць гарадскіх дэпутатаў за іх праеўрапейскі падыход да спраў і праблемаў нацыянальных меншасцей і звяртаюць увагу, што і ў Гайнаўцы ўведзены ўжо стандарты, якімі здаўна карыстаюцца нацыянальныя меншасці ў Швейцарыі, Бельгіі і іншых краінах Еўрасаюза. Войты і бурмістры нашых гмін таксама хочуць ісці „з духам часу" і пераконваюць сваіх радных прымаць падобныя пастановы і на акраінах вёсак стараюцца як мага хутчэй устанавіць указальнікі з двухмоўнымі назвамі. Варта б паказаць, што мы не астаёмся далёка ззаду за немцамі і літоўцамі ў справах ушанавання роднай мовы.

Можа супольнымі намаганнямі беларусаў з падтрымкай польскага грамадства частку мараў удасца памяняць на рэчаіснасць.

Вёска ў пушчы

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Злажу ў Пагарэльцах з аўтобуса пабачыць як выглядае вёска ў цэнтры славутай Белавежскай пушчы пасля сезона. Недалёка прыпынку бачу групку пажылых вяскоўцаў. Дабіраюся да іх кашэчым ходам, каб прыслухацца якой мовай яны карыстаюцца. Бо ж у такой мясцовасці, дзе турыстаў можа быць больш чым камароў, жыхары маглі не толькі змяніцца ў прыстасаванскіх касмапалітаў, але нават прыняць некаторыя іх прыметы, у тым ліку і мову. Нейкія вучоныя, аднак, заўважылі, што чалавека можна лічыць старым, калі ён не ў змозе вучыцца. „Мае" старажылы гаварылі ўжо яшчэ на мове сваіх тутэйшых продкаў...

Паколькі вяскоўцы былі заняты нейкай сваёй важнай справай, не ўступаў я ў размову з імі, толькі выведаўшы неабходны мінімум падаўся далей.

У Пагарэльцах маю ўвагу прыцягнуў будынак з шыльдай галерэі. Паколькі дзверы гэтай установы былі адкрыты, дык я і прасунуў нос у напрамку інтэр'ера, не асмельваючыся ўступаць хадзіўшым па вясковай вуліцы абуткам на бліскучую падлогу...

Яшчэ сядзіць ува мне нейкі мужыцкі атавізм, які ўнушае, што на вясковай вуліцы можна пабрудзіць абутак. Але ў сённяшні час лягчэй набраць нечыстот на падэшвы ў горадзе, чым на вёсцы. Прынамсі з нашых вёсак знікае жывёла, якая не вельмі дбае пра прынцыпы вулічнай эстэтыкі і гігіены. Цяпер, здаецца, больш усялякай жывёлы ў горадзе чым на вёсцы. Меншае пасеваў, меншае збожжа, зводзяцца мышы, становяцца непатрэбнымі каты. І з сабакамі таксама старым людзям адно клопат. І кароў амаль няма, і гусей, ад якіх была найбольшая небяспека для чысціні абутку.

Гаспадары галерэі „Крэсы" паставіліся да мяне як да патэнцыйнага свайго кармільца, што захоча даць ім зарабіць, і ветліва запрасілі ў сваю ўстанову. Праўда, я празмерна не цікавіўся прапановай, не дурыў гаспадарам галоў, бо не выбраўся ў пушчу ў гандлёвых мэтах. А галерэя прапануе творы выкананыя са шкла, гліны, драўніны, тканіны...

Уласнікі галерэі прыезджыя, варшавякі. Нейкі час прыязджалі яны сезонна ў Пагарэльцы, пасля купілі тут пляц з будынкамі і перабраліся сюды са сталіцы зусім. Галерэю ўладзілі ў былым хляве, а ў ранейшай клуні — начлежныя месцы.

Начлегі прапануюць у Пагарэльцах у шасці з дваццаці чатырох хат. Адзін з гаспадароў трымае коней дзеля катання турыстаў. Дзве гаспадыні начлежных хат рыхтуюць выдатныя пачастункі сваім гасцям.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Ездзіць у пушчу можна толькі за драўнінай

Але ўжо для іншых турыстаў, напрыклад, замежнай моладзі, якой мноства ездзіць праз вёску ў летні сезон, пачастунку ў іх няма: купляй начлег — будзе ежа. Няма ў Пагарэльцах і крамы, а гэта ўрон не толькі турыстам, якія хацелі б купіць хаця б нешта напіцца ў гарачы час, але і карэнным жыхарам вёскі, бо ў мабільных крамах надта высокія цэны. Жанчына, якая мне пра гэта гаварыла, сказала, што толькі машына з хлебам з Нараўкі мае нейкую спагаду для сялянскіх кашалькоў.

Зямлі ў Пагарэльцах, па сутнасці, ніхто ўжо і не абрабляе. Палі запушчаныя, мабыць, на іх вырасце палявы нацыянальны парк, побач лясного. І мо той палявы нацпарк будзе менш непакоены чалавекам, чым лясны, бо нават з асфальтоўкі відаць, што славуты лес сякуць цалкам афіцыйна. Яшчэ ён, мабыць, адрасце, але ж залежы мінеральных рэчываў у пушчанскай глебе не бесканечныя і пасля каторайсь там высечкі пушча мо і не падымецца ў свой рост...

Хаты ў пушчанскіх вёсках яшчэ традыцыйныя, драўляныя, але іх выгляд ідзе ў розных напрамках. Некаторыя разбудаваны для прыёму турыстаў, а некаторыя і зусім хіляцца. Вось пра адну пустую хату сказалі мне пагарэльскія мужыкі, што яе купіў ужо нейкі варшавяк, а ранейшы яе ўласнік жыве ў Гайнаўцы ў блоку... З абодвух канцоў вёскі растуць мураванкі. Наш чалавек, як тая рыба ў пагаворцы — шукае дзе глыбей; у цяперашні надта мабільны час некаторым „глыбей" у горадзе, іншым — у вёсцы.

Пагарэльцы мяняюць свой агульны выгляд. У нашу эпоху, калі ранейшую ручную працу сталі выконваць машыны, людзі вызваленыя ад вытворчага занятку атрымалі ўзамен час, які таксама трэба „абрабляць". Час, які раней забірала праца, сёння займаюць розныя пагулянкі, розныя спектаклі, у тым ліку і сузіранне прыроды. Гэты час масавага назіральніка трэба абслужыць, падсунуць яму пад сам нос лес для аглядання, і некаторыя жыхары пушчанскіх вёсак сталі зарабляць гэтакім чынам на хлеб. Але не ўсе, бо ў людзей розныя схільнасці і здольнасці; іншыя раз'ехаліся па шырокім свеце зарабляць на свой хлеб па-другому. А вынікам такой міграцыі астаўся выгляд пушчанскіх вёсак, не толькі Пагарэльцаў, але таксама суседскіх Тэраміскаў і Будаў. Вось у Тэрамісках на будынку былога пункта скупкі малака на ўсю сцяну нашпрэены сімвалы беластоцкай „Ягелоніі". Ці калісь хто там чуў пра такую спартыўную каманду, ці нават пра сам футбол, выдумку англічан перыяду прамысловай рэвалюцыі? Вось нашчадкі колішніх вяскоўцаў, што гнулі спіну над апрацоўкай зямлі, цяпер або самі каратаюць час, бегаючы за мячом па гладкім полі, або ўзіраюцца як за мячом бегаюць іншыя. Змяняецца свет, а следам за ім змяняюцца і нашы вёскі, нават тыя, што ў сэрцы запаведнай пушчы.

Дзень сеніёра

Віктар БУРА

27 кастрычніка ў Гайнаўскім доме культуры сабралася „старэйшая моладзь" — так сябе называюць гайнаўскія пенсіянеры, згуртаваныя ў Гайнаўскім аддзяленні Саюза пенсіянераў і інвалідаў, які ўзначальвае Мікалай Чыквін.

Хаця галовы маіх сяброў пакрытыя ўжо серабром, яны заўсёды адчуваюць сябе бадзёра, жыццярадасна, таму што заўсёды спадарожнічаюць ім жанчыны. Пенсіянераў у гэты дзень чакалі накрытыя белымі абрусамі сталы. Па зале разыходзіўся пах падрыхтаваных смакоццяў — пячэння, свойскай каўбаскі, пушчанскіх грыбоў, настоек і віна.

На вечарыну пенсіянеры запрасілі членаў „Дубінскай капэлы" — Анну Карэтка і Пятра Скепку, якія весялілі публіку спевамі ды ігрой на акардэоне і іншых інструментах. Трэба сказаць, што Аня не толькі прыгожа спявае, але і бліскуча іграе на гармоніку. Іх выступленні заўсёды дораць пенсіянерам добры настрой, выклікаюць успаміны радаснай маладосці.

А танцоркі былі густоўна апранутыя, з прыгожымі прычоскамі. Не аднаму танцоўшчыку падняўся ўзровень адрэналіну, калі вока спынялася на дэталях жаночага стану.

Трэба адзначыць пазітыўнае стаўленне павятовых і гарадскіх улад да пенсіянерскай арганізацыі, да пажылых людзей у прыватнасці. Кожнае мерапрыемства ладжанае старшынёй Мікалаем Чыквіным удастойваюць прадстаўнікі ўлад. У апошнюю кастрычніцкую суботу гасцямі пенсіянераў былі стараста Уладзімір Пятрочук, віцэ-стараста Ежы Сірак і бурмістр Анатоль Ахрыцюк. З вялікай увагай да старэйшага пакалення адносіцца малады яшчэ дырэктар ГДК Андрэй Скепка. Ён ніколі не адмовіў пенсіянерам у дапамозе, за што астатнія шчыра яму дзякуюць і спадзяюцца на далейшае супрацоўніцтва.

Падарожжа ў перапоўненых вагонах

Ад апошняга майго падарожжа ў Беларусь мінула больш за шэсць месяцаў. Раней карыстаўся я аўтамабільным транспартам. Паколькі пры праездах у Пяшчатцы (на беларускім баку) кожны раз узнікалі спрэчкі з пагранічнікамі з-за нечарговых праездаў, дык рашыў я пакарыстацца чыгуначным транспартам. Зараз з праездам няма праблемы. У мяне ў кішэні сапраўдная віза. Купіў я затым за 2 еўра (7,62 зл.) на чаромхаўскай станцыі зваротны білет у Высока-Літоўск, медычную страхоўку за 2 долары на беларускім баку (на чацвёра сутак) і... паехалі!

На чыгуначным пагранпераходзе Чаромха — Высока-Літоўск няма лепшых і горшых. Кожнаму ў рэйкавым аўтобусе месца хопіць. Мала калі падарожнічае ім больш чым норма, г.зн. пяцьдзесят пасажыраў. Але і такія выпадкі здараюцца, а тады ўзнікаюць праблемы, напрыклад, у пятніцу, 26 кастрычніка. Вяртаўся я з Высокага ў Чаромху ў 9^{54}. Калі падаўся я ў камеру мытнага кантролю, дык прыкмеціў, што яна запоўнена дзеткамі. Пачаткова я лічыў, што яны адпраўляюцца ў Брэст ды карыстаюцца адно супольным выхадам на пероны (цягнікі ў Чаромху і Брэст адпраўляюцца з усходняга боку). Але інспектар мытнай службы развеяла мае сумненні, сказаўшы: „Уважаемыя граждане. Дайте пройти группе. Всем места в поезде хватит". Аднак так не было. У рэйкавым аўтобусе на 52 сядзячыя месцы дзве экскурсіі школьнай моладзі занялі сорак пяць. А варта адзначыць, што ў гэты час падарожнічала некалькі дзесятак як польскіх, так і беларускіх турыстаў. Старэйшыя бабулькі вымушаны былі стаяць. Праблема была таксама для падарожных з большым багажом. Два вагончыкі рэйкавага аўтобуса былі бітком набітыя. Здзіўляе мяне факт, што аб праездзе згаданай групы школьнікаў з Беларусі ў Бельск-Падляшскі ведала Прадпрыемства рэгіянальнай пасажырскай перавозкі, якое на заяву паслаць на азначаны курс пасажырскі вагон з большай колькасцю месц паставілася адмоўна. Вось, даражэнькія, як шануе сваіх кліентаў наша чыгунка. Для іх важнае адно ўзяць грошы за праезд, а на бяспечнасць і выгаду пасажыраў ім наплываць.

І яшчэ адна важная справа. На лініі Высока-Літоўск — Чаромха курсіруе рэйкавы аўтобус старога тыпу без... туалета. І тут узнікаюць праблемы, калі камусьці захочацца справіць свае фізіялагічныя патрэбы ў час пашпартнага кантролю на раз'ездзе. Такой асобе трэба прасіць у пагранічніка дазволу выйсці на абочыну. Такое здаралася мне бачыць апошнім часам у Голі. Указаныя факты пакідаю без каментарыя.

Даехалі мы ў гэты дзень у Чаромху без праблемы. Пашпартна-мытны канроль польскіх служб прайшоў спакойна. І мне тады пашанцавала. Пазнаёміўся я з сімпатычнай жанчынай з Брэста, якая ехала ў Чаромху ў госці да сваякоў, добрых маіх знаёмых. З кароценькай размовы я даведаўся, што бацьку маёй спадарожніцы немцы ў 1941 годзе арыштавалі і вывезлі ў Польшчу, дзе разам з тысячамі палонных казнілі ў Грондах-Велькіх каля Астрові-Мазавецкай.

Уладзімір СІДАРУК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

У „ТРОЙЦЫ" СЯРОД СЯБРОЎ

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

II клас гімназіі з выхавацелькай Валянцінай Бабулевіч

— А хто з вас на працягу дваццаці хвілін прачытае ўсю „Зорку"? — пытаю ў бельскіх гімназістаў.

У адказ бачу некалькі рук, павучнёўску паднятых уверх. Адзін, два, тры, чатыры, пяць… — лічым супольна з настаўніцай.

Ужо на пачатку гімназісты сказалі, што ўсе ў класе (тут 24 вучні) падпісваюцца на „Ніву" і чытаюць яе з прыемнасцю. Гэта такая прывычка.

— А ты чаму не падымаеш рукі? — настаўніца Валянціна Бабулевіч напамінае хлапца з жывымі вачыма…

— А, так! — гімназіст марудна далучаецца да дзявочай кампаніі. У нашых школах чамусьці больш адважныя дзяўчаты. Але ў другім класе справа маецца зусім інакш; хлопцы тут хоць і сціплыя, але вядомыя зоркі! Матэвуш Магрук і Куба Філіпюк з наймалодшых гадоў выступаюць у конкурсе „Роднае слова" і заваёўваюць першыя месцы. Матэвуш, Куба і яшчэ іх класны сябра Міхась Шум таксама займаюцца ў беларускім тэатры, які вядзе спадарыня Эля Фіёнік у Бельскім доме культуры. Іх тэатр — адзін з найлепшых на нашай беластоцка-беларускай сцэне.

— А наша сяброўка Марта Маліноўская ў час мінулагодняга конкурсу беларускай песні выступіла сола і заваявала першае месца, — дадае класная старасціха Марта Юрчук.

Марта пра свой клас кажа адно: мы — дружныя! Калі ідзе пра ўзровень навучання, у мінулым годзе іх клас заняў другое месца (на пяць).

Сяброўская атмасфера ў школе — гэта першая і найважнейшая рыса, якая падабаецца ўсім маім субяседнікам. Вось, Юстына Кажанецкая раней вучылася ў школе н-р 4. Чаму перайшла ў „тройку"? Бо аднойчы прыйшла сюды са сваім старэйшым братам (які хадзіў у белліцэй) упрыгожваць залу пад *стоднёўку* і… спадабалася ёй тут. Цяпер Юстына спявае ў беларускім гурце „Капрыс" і прадстаўляе школу ў спорце (спецыялізуецца ў гонках).

— А чаму я прыйшоў у беларускую гімназію? — думае ўголас Дамінік Бенаш, які раней вучыўся ў бельскай „пяцёрцы". У адказ чуем знаёмыя словы:

— Тут у мяне больш сяброў, чым там.

У класе сустракаем таксама дзяўчат з галерэі „Зоркі". Бася Карыцкая спачатку называе мовы, якія разам з сябрамі мае магчымасць вывучаць у школе. На першым месцы называе беларускую, пасля рускую, англійскую, польскую… Бася ўспамінае і незабыўныя экскурсіі, на якіх пабывалі яны разам са сваёй выхавацелькай Валянцінай Бабулевіч.

— Мы арганізавалі вандроўку ў ацалелыя часткі Бельскай пушчы, — кажа настаўніца.

— Каля Гацькоў?

— Не, каля Галадоў.

Апошняя вестка заставіла падумаць таксама пра асаблівую прыкмету школы. Не ў кожнай бельскай школе азіраюцца на мінуўшчыну. А тут адшукваюць яшчэ жывыя фрагменты старой, быццам неіснуючай ужо, пушчы!

zorka@niva.iig.pl

Янка ЖУРБА

Вавёрка

Я рухавы звярок,
Заўжды весела мне.
Мая хатка — дупло
На высокай сасне.
Я на дубе нарву
Шмат буйных жалудоў
І к зімовай пары
Прынясу іх дамоў.
На галінках сасны
Я прыбоў нанашу.
Іх багата к зіме
У свой дом насушу.
Я рухавы звярок —
Шмат арэхаў знайду,
Самых лепшых нарву
І ў дупло пакладу.
Не баюся зімой
Я марозаў ліхіх:
Спачываю ў дупле
На лісточках сухіх.
А як сонца зірне,
Я скачу па сасне.
Цёпла ў шубе маёй
І суровай зімой.

ПІСТОРЫЯ ПРА ДЗЯЎЧЫНКУ З ЛІСТАПАДА

Быў на свеце добры хлапчына Юры і была яшчэ на тым свеце восень. А вось каго ў Юрыка не было — дык добрай, прыгожай дзяўчыны. Не было вельмі даўно…, а дакладней — ніколі. І ў гэтую восень — таксама.

І шумеў лістапад, хлопец выйшаў у яго, і… раптам спыніўся. Ён адчуў, ён убачыў і ўсё зразумеў. Ападала чыстая лістота таполяў — і гэта былі вочы дзяўчыны. Кружлялі лёгкія лісты клёнікаў — і гэта былі рукі дзяўчыны. Абляталі дубочкі — і гэта былі ногі дзяўчыны. Атрасалі бярозкі сваю залацістасць — і гэта былі валасы дзяўчыны. Асыпаліся ліпы, гарэлі рабіны, трымцела пад ветрам мядзяная россып асінак, веяла прахалодай ад дрогкіх пальчыкаў тонкіх акацыяў, клалася бархотнымі лістамі адзеннем ляшчына.

І шумеў, не змаўкаў лістапад; і вось з'явілася, выйшла з яго да хлапчыны дзяўчына. Яна была… Толькі няма такіх слоў, каб апісаць, якою яна была. А ёсць лістота, лістота, лістота. А яшчэ восень. І чаканне, звычайнае, простае, чалавечае такое чаканне.

Вось чаму Юры сказаў ёй толькі адзіныя словы:

— Я чакаў цябе ўсё жыццё. Але адкуль ты магла ведаць, што я буду цябе чакаць?!

І пачуў толькі адзіны адказ:

— А адкуль ты сам мог ведаць, што сёння? У гэты лістапад? І так, толькі так, як ты сам склаў для мяне лісты?..

— Не хапае апошняга… — працягнуў ён дзяўчыне маленькі лісточак жывой шыпшыны. І яна — не адымала рукі.

Так ішлі: рука з рукою, вочы ў вочы, шэпт у шэпт — неадрыўна.

І шумеў, засыпаў, высцілаў ім шлях лістапад…

Ваш Дзядзечка Сід

13 кастрычніка 2007 г., Кобрын

ТУТЭЙШЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Помста шэрых мышанятак

Амаль усе беластоцкія скейты абмінаюць мяне шырокім кругам. Яны думаюць што я — псіх або нецікавая, шэрая мышка. Хлопцы ведаюць мяне ўжо амаль год, аднак на вуліцы не гавораць мне „*чэсць*". Пасля такой сустрэчы ў мяне заўсёды дрэнны настрой.

Сярод іх ёсць адзін вынятак. Яго завуць Пятрусь. Мы пазнаёміліся на доўгім перапынку ў нашай школе побач гімнастычнай залы. Спачатку ён ставіўся да нас з насцярожанасцю, як яго сябры. Пасля месяца Пятрусь змяніўся. Зараз хлапец праводзіць з намі ўсе перапынкі і смяецца з нашых жартаў. Яго дзяўчына ад зайздрасці скрыгоча зубамі, бо падазрае, што адна з нас, я або Лёля, хоча ёй адбіць хлапца.

У пачатку сакавіка Пятрусь пазнаёміў нас са сваімі сябрамі — скейтамі. Мы з Лёляй пабывалі на прэзентацыі іх фільма. У гэты час яны не былі яшчэ такой папулярнай субкультурай у нашым горадзе. Мабыць таму яны адносіліся да нас ветліва і былі адкрытымі на знаёмствы. Калі мы сустрэліся другі раз, у маі, скейты рабілі выгляд недаступных. Нам было прыкра, але мы доўга не пераймаліся імі. Вырашылі, больш не сустракацца з такімі. Навошта адчуваць сябе шэрымі мышанятамі сярод надзьмутых прыгажуноў?!

Наш сябра Пятрусь кажа, што яго сябры толькі прыкідваюцца важнымі. У сапраўднасці яны файныя і цікавыя хлопцы. Ім толькі не хапае адвагі, каб пачаць размову з такімі *шалёнымі* дзяўчынамі як мы з Лёляй...

Цяпер мы з Лёляй часта сустракаем скейтаў на рок-канцэртах. Звычайна яны нас не пазнаюць. Апошнім часам, калі яны пабачылі, што мы ведаем больш чым яны людзей, адразу пачалі каля нас церціся. Мы, вядома, зрабілі выгляд быццам іх бачым першы раз у жыцці. І добра! Хай яны таксама адчуюць як гэта цудоўна быць *шэрай мышкай!*

Тэкст: truskawka9922@tlen.pl
Дызайн: lolcia05@tlen.pl

Музыка з кайфам

У чарзе ... да „Крамы"

На мінулым тыдні сустракаліся мы са сцэнічнай моладдзю, але беларуская музыка настолькі багатая, што ў кожным пакаленні знойдзем цікавых, а часам проста выдатных выканаўцаў! Тады сёння прысвяцім крыху месца чарговай жывой легендзе беларускай сцэны. Даўным-даўно называліся яны „Рокіс", але знайшліся прычыны, па якіх у 1991 годзе памянялі назву на „Крама" і пэўна нават не падумалі, што будуць найбольш вядомай музычнай крамай у Сярэдне-Усходняй Еўропе.

Пачаткі іхняй творчасці былі цяжкія. Тадышнія ўмовы не дазвалялі свабодна запісваць альбомы. Першы альбом „Хворы на Rock-n-Roll" запісвалі, можна сказаць, падпольна, пераважна на студыі вядомых „Песняроў", у 1991-1993 гадах. Тады ўжо было вядома, што ў беларускай музыцы ўзнікае незвычайная з'ява. Музыкі згодна прызнаюць, што першы альбом гэта самы лепшы іхні дыск. Хаця, аб'ектыўна кажучы, першы падарунак слухачам яшчэ не вызначаў своеасаблівага стылю. Ігар Варашкевіч — вакаліст, фронтмен ці проста лідэр гурту — сказаў, што добравядомы нам сучасны гук гурту ўзяў свой пачатак у альбоме „Камендант", а гэта была ўжо чацвёртая прадукцыя ад 1995 года. Увогуле ўсіх крамаўскіх выпускаў было дванаццаць: касеткі, дыскі, сінглі. Напэўна варта слухаць „Краму" з яе розных творчых перыядаў, каб даслухацца гэтай арыгінальнасці ў музычнай форме. Гэта не блюз, як некаторыя кажуць, гэта і не рытм-н-блюз, а і проста рокам цяжка гэта назваць. „Крама" выпрацавала сваю мову і таму столькі гадоў беспраблемна гутарыць са слухачамі.

Напэўна думаеце чаму такі вось загаловак? Можа таму, што моладзь слухае перш за ўсё маладых жорсткіх гуртоў або лёгкага гіп-гопу ці папсы, а „Крама" так лёгка не паддаецца сучаснасці і проста іграе сваё, да чаго неаднакратна проста трэба даспець. Не паверыце, мабыць, але я пазнавала гэты гурт толькі з ліцэя, дзякуючы песні „Стэфка" — каверу на песню гурту „Бонда". Шляхі бываюць доўгія, але галоўнае, каб у чарзе задоўга не стаяць. Для вас „Крама" заўсёды адкрытая!

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

Дай есці, мама

Пасля цяжкіх заняткаў
Прыйшоў са школы Якаў.
— Дай хутка есці, матка,
Галодны як сабака!

Хачу я есці пільна,
Шукаю добрай рэчы.
Бачу наш халадзільнік
Запоўнены пустэчай.

Спачуванні

— Боль твой немагчымы,
Мой даражэнькі Якаў.
Чуў я пад дзвярыма
Як ты страшэнна плакаў.

— Вытрымаў я здзекі,
Азваўся раптам малец. —
Гэта крычаў мой лекар,
Яго ўкусіў я ў палец.

Польска-беларуская крыжаванка № 46



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 42: Ар, краска, мятла, там, святло, лом, пан, морква, смык. Вясло, твор, клямка, брат, Ас, стоп, Ака, рамонак.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Паўліна Іванюк, Юлія Панютыч, Ася Нявінская** з Бельска-Падляшскага, **Юстына Анішчук, Моніка Ігнацюк, Кацярына Сэвастыянік, Ева Капытка, Марта Адамюк** з Чыжоў, **Паўліна Лук'янюк** з Нарвы, **Івона Баршчэўская** з Орлі. Віншуем!

Беларуская асвета ў Еўрасаюзе (2)

Ганна КАНДРАЦЮК

Беларускае школьніцтва ў Літве адрадзілася на хвалі вялікіх перамен у СССР. Думка пра школу ўзнікла ўжо ў 1988 годзе, калі адраджаліся беларускія суполкі, — кажа Леакадзія Мілаш, настаўніца рускай мовы ў Сярэдняй беларускай школе імя Францішка Скарыны ў Вільні, дзяячка Таварыства беларусаў Літвы.

Ініцыятарамі была невялікая кучка беларускай інтэлігенцыі на чале з Лявонам Луцкевічам. У іх ліку былі Зоська Верас, Хведар Нюнька, Лявон Кароль, Валянцін Стэх (тадышні кіраўнік беларускай суполкі „Сябрына"). Спачатку працавала толькі нядзельная школа. Сярод першых выкладчыкаў былі Алена Папова і сённяшні дырэктар школы Галіна Сілава.

Сярэдняя школа заснавана ў 1992 годзе.

Якім шляхам шукалі вучняў? Ці хадзілі ад дому да дому — як у нас — і намаўлялі запісаць дзіця ў беларускую школу? Не, тут было інакш.

Школа арганізавалася ў пэўнай ступені сама па сабе, што ў беларускім свеце гэта свайго роду феномен.

— Далі аб'яву ў прэсу і адразу прыйшлі вучні ва ўсе 12 класаў. Быў поўны набор. Мы самі былі здзіўлены. На самым пачатку было пад дзвесце вучняў. Гэта многа. Зараз у нас усіх 136 школьнікаў, — успамінае Леакадзія Мілаш. Настаўніца з захапленнем прыгадвае атмасферу, якая панавала ў пачатку 90-х. Тады дырэкцыя цесна супрацоўнічала з „Сябрынай", запрашала дзеячаў на кожную ўрачыстасць, ладзіла сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі і мастакамі, адзначаліся патрыятычныя святы. Іх школу наведалі Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін. Вучні сустракаліся з віленскім паэтам Алегам Мінкіным і мастакамі (інтэр'ер у некаторых залах праектавала віленская мастачка Хрысціна Балаховіч).

— Памятаю як тады Лявон Кароль гаварыў: „Каб у мяне быў унук, то нягледзячы на ўсякія мінусы, я абавязкова аддаў бы яго ў беларускую школу", — выклікае чарговы ўспамін Леакадзія Мілаш. Зараз многае памянялася ў бок заняпаду. Пра прэстыж школы найчасцей гаворыцца ў прошлым часе. Некаторыя настаўнікі, што асабліва баліць свядомых настаўнікаў-беларусаў, не пасылаюць сюды сваіх дзяцей. Кажуць, што ім не па дарозе або задалёка.

* * *

Паехала я сама ў беларускую школу. Ад рання ў Вільні ішоў праліўны дождж. Добра, што дамовілася я на канкрэтную гадзіну з настаўнікамі, інакш бы не хацелася выходзіць з цёплай кватэры. У школу, якая знаходзіцца ў раёне Каралінішкі (віленчукі кажуць, што гэта не надта перспектыўны раён), я дабіралася на аўтобусе. Пасля пэўны адрэзак, прыблізна 500 метраў, трэба было ісці пешшу. Для святога спакою я спытала яшчэ пра дарогу ў жанчыны. Яна не ведала, што ў яе квартале знаходзіцца беларуская школа. Амаль усе, хто вяртаецца з Вільні, наракае на закрытасць і сепаратызм літоўцаў, іх неахвоту адказваць на пытанні пастаўленыя на польскай ці рускай мовах. Нават даведнікі падказваюць, што найперш трэба прывітацца па-літоўску, пасля папрасіць прабачэння, што не ведаеш іх мовы, каб у канцы прыступіць да асноўнага. Як у маім банальным выпадку — спытаць пра дарогу. Метад спрацаваў на дзвесце працэнтаў! Жанчына, якая не ведала дзе знаходзіцца беларуская школа, пазваніла па прыватным мабільніку на працу, каб там па Інтэрнэце высветлілі пытанне. Абмеркаванне праблемы ці Ганна Кандрацюк ідзе ў добры бок з дапамогай сотавага тэлефона і Інтэрнэта цягнулася дзесяць хвілін, усё на кошт незнаёмай. І кажуць, што людзі тут закрытыя!

Фота Ганны Кандрацюк

Леакадзія Мілаш з дачушкай Ксеняй і яе сяброўкамі

Фота Ганны Кандрацюк

На ўроку малявання

Фота Ганны Кандрацюк

Інфармацыю пра школу найхутчэй знойдзеце ў будынку

Бяда ў тым, што беларуская школа прыхаваная ад вачэй і не існуе ў свядомасці віленчукоў. Пра гэта я пераканалася асабіста. Трыста метраў далей я зноў спытала выпадковага пешахода, ужо з чыстай цікавасці, ці добра іду ў беларускую школу. Дзядзька якраз выгульваў сабаку. Ён, хоць жыхар квартала, не ведаў ды памылкова накіраваў мяне ў літоўскую школу. Там адразу паінфармавалі нейкім свойскім тэкстам.

— Яна пад самым лесам, у канцы вуліцы.

* * *

— Якія ў бацькоў матывацыі пасылаць у беларускую школу дзяцей? — пытаю ў Леакадзіі Мілаш, знакамітай русісткі, якую грамада назначыла прэзентаваць школу. Тое, што спадарыня Мілаш русістка, найперш здзівіла мяне, а пасля журналістаў „Нівы". На нашых старонках друкуюцца яе віленскія допісы, прасякнутыя захапленнем беларускай культурай і патрыятызмам. Настаўніца запісала ў школу сваю дачушку. Праўда, пад уплывам аднагодкаў, малая пачала размаўляць на рускай мове, якой не ведала раней.

— Першая справа, — кажа мая субяседніца, — наша школа невялікая. У класе, прыблізна, па 10 вучняў. Навучанне, можна сказаць, амаль індывідуальнае. Другая справа — у нас высокі ўзровень навучання англійскай мовы. Гэты прадмет выкладаюць выпускнікі Міжнароднага лінгвістычнага універсітэта ў Мінску. Гэта спецыялісты высокага класа ў параўнанні да віленскіх стандартаў, дзе замежныя мовы выкладаюць звычайна выпускнікі каледжаў. У школе моцныя выкладчыкі літоўскай мовы, а таксама матэматыкі. Іх прэстыжным прыярытэтам з'яўляюцца экалагічныя праекты. Вучні, якія прымаюць удзел у праекце, ездзілі ўжо ў Чэхію і Ірландыю. На базе іх школы ладзяцца міжнародныя экалагічныя канферэнцыі. З дакладамі прыязджаюць сюды выкладчыкі Сахараўскага універсітэта...

(працяг будзе)

Важнае месца для беларускай культуры

Размова з Алінай ДЭМБОЎСКАЙ, кіраўніком Музея ў Бельску-Падляшскім (змяшчаецца ў гарадской ратушы), што з'яўляецца аддзяленнем Падляшскага музея ў Беластоку.

— У вашым музеі, апрача пастаянных экспазіцый, ладзіцца многа часовых выставак і разнародных сустрэч. Я найчасцей трапляў на прэзентацыі беларускай культуры і мясцовых традыцый Бельшчыны. Якое месца займаюць яны ў вашай дзейнасці?

— Беларускія мерапрыемствы займаюць у нас важнае месца. Прэзентуем матэрыялы па гісторыі рэгіёна і знаёмім з традыцыямі Бельшчыны. У гэтым годзе мы паказвалі выстаўку „Графіка і кераміка Тамары і Уладзіміра Васюкоў", прывезеную з Мінска, якая спадабалася моладзі і дарослым наведвальнікам нашага музея. У гэтым годзе мы ладзілі сустрэчы, у час якіх старэйшыя людзі знаёмілі вучняў з традыцыямі святкавання Хрыстовага Нараджэння. Дзеткі знаёміліся таксама з велікоднымі абрадамі, малявалі яйкі і выконвалі кветкі. Раней Надзея Анацік з Ягуштова вяла заняткі, у час якіх вучыла аздабляць велікодныя яйкі. Ладзілі мы таксама супольныя заняткі для дзетак і старэйшых людзей, у час якіх вучні знаёміліся з харчаваннем у мінулым.

— У вашым музеі знаходзяцца этнаграфічныя экспанаты з навакольных вёсак і вырабы народных мастакоў Бельшчыны.

— Гаворым у нас аб вясковым жыцці і ладзім мерапрыемствы супольна з жыхарамі сёл. Арганізавалі мы сустрэчы ў Ягуштове і Грыневічах-Малых. На музейных уроках паказвалі мы вучням як апраналіся іх дзядулі і бабулі.

— Вы супрацоўнічаеце з Музеем малой айчыны ў Студзіводах і арганізуеце супольныя сустрэчы.

— Мы абменьваемся вопытам з Музеем малой айчыны або звяртаемся да студзіводскага музея за дапамогай. Удалай была супольная прэзентацыя кніжкі „Песні Бельскай зямлі", якой спадарожнічалі спевы, а раней ладзілі мы канцэрт у рамках фестывалю „Там па маёвай росі" і супольна арганізавалі выстаўку „Народная вопратка беларусаў Падляшша".

— У музеі збіраеце помнікі мінуўшчыны датычныя гісторыі Бельска-Падляшскага і яго наваколля. У вас ёсць багатая калекцыя здымкаў і паштовак, якія расказваюць пра гісторыяю горада. Ці ў музеі ёсць таксама экспанаты выкапаныя ў час будаўнічых работ, якія сведчылі б аб гісторыі Бельска?

— Археалагічныя экспанаты, знойдзеныя ў нашым горадзе, знаходзяцца пастаянна ў археалагічным аддзяленні Падляшскага музея ў Беластоку. Калі ёсць патрэба, мы бярэм гэтыя экспанаты і паказваем на выстаўках у Бельску. Апошнім часам паказвалі мы прадметы знойдзеныя ў час раскопак, якія вяліся перад будаўнічымі работамі ў нашым горадзе. Прэзентавалі мы кераміку XIII стагоддзя і элементы дубовай канструкцыі XV стагоддзя. Ладзілі мы таксама мультымедыйны паказ знойдзеных у Бельску экспанатаў. Пазней прэзентавалі таксама экспанаты знойдзеныя ў рэзідэнцыі Сапегаў у Дубне і здымкі з гэтага месца. Выдалі мы паштоўкі, на якіх паказваецца Бельск XX стагоддзя, і набор здымкаў помнікаў нашага горада.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Аліна Дэмбоўская

— Зараз у вашым музеі ствараецца калекцыя работ мастакоў, якіх жыццё звязанае было ў нейкай ступені з Бельскам-Падляшскім. Калі можам разлічваць на супольную выстаўку?

— Калі ладзяцца ў нас выстаўкі прац нашых мастакоў, яны пакідаюць у музеі па адной сваёй рабоце. Можа праз год наладзім ужо выстаўку, якую зможам паказаць у Мінску ці Гродне. Паказалі б мы там працы Маргарыты Дмітрук, Славаміра Рыбака і іншых нашых мастакоў.

— Цяпер у вас працуе выстаўка „Мастацтва не ведае межаў, сустрэчы пакаленняў" — плён праекта, у якім прынялі ўдзел вучні і старэйшыя жыхары Бельшчыны. Ці многа супольнага можна знайсці ў работах дарослых, моладзі і дзетак, сярод якіх вялікую частку састаўлялі вучні бельскай „тройкі"?

— Вучні „тройкі" прымаюць удзел у многіх нашых мерапрыемствах і сустрэчах. Супольнай рысай мастацкіх работ можна назваць хаця б радасць жыцця. Калі сеніёры і моладзь лепш пазнаёміліся, адкрыліся на сябе. Аднак старэйшыя людзі найчасцей карысталіся традыцыйнымі мастацкімі тэхнікамі, а маладыя людзі аб'ядноўвалі ў сваіх работах розныя тэхнікі на сучасны лад.

— Зараз Вы рэалізуеце праект „Панібрацтва з археалогіяй". Якія прапановы Вы падрыхтавалі для вучняў і настаўнікаў, якія з'яўляюцца, хіба, галоўнымі ўдзельнікамі гэтага праекта?

— У рамках гэтага праекта падрыхтавалі мы 6 сустрэч, а ў час кожнай маецца мультымедыйная прэзентацыя, знаёмства з тэорыяй і практычная частка, майстар-класы. Расказвалі мы дзеткам, што гэта такое археалогія, вучні малявалі пячоры і звяркоў, займаліся ганчарствам. Будзем рабіць з дзеткамі пацеркі, пярсцёнкі і іншыя ўпрыгожанні з мінулага, а даўнюю моду вучні будуць прэзентаваць у сваіх школах. Будзе таксама многа іншых займальных заняткаў, а цікавейшыя моманты ў ходзе рэалізацыі праекта хочам сфатаграфаваць і пасля запісаць здымкі на дыску.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Бельская ратуша гэта цудоўнае месца для нашага музея, — лічыць яго кіраўнік Аліна Дэмбоўская

— Да моладзі сярэдніх школ Вы выйшлі з праектам „Ікона — наша спадчына", які ўжо рэалізуецца. Ці сустрэўся ён з зацікаўленнем?

— Ліцэісты ахвотна прыступілі да нашага праекта, у час якога будзем расказваць пра пісанне ікон на Бельскай зямлі. Хочам мы наведваць бельскія цэрквы і знаёміць з іх гісторыяй, а перад усім будзем расказваць пра Бельскую ікону Божай Маці. Прадбачваем наладзіць экскурсію ў Музей ікон у Супраслі і пабываць у Школе іканапісання ў Бельску. Хочам, каб моладзь стала больш актыўнай і пасля ў час майстар-класаў паспрабавала пісаць іконы.

— Вы ладзіце многа музейных урокаў. Якія ў Вас зараз прапановы для вучняў і ці можа прыязджаць сюды ў адукацыйных мэтах моладзь з-па-за Бельшчыны?

— Прыязджаюць да нас вучні з-па-за Бельшчыны, хаця б моладзь гайнаўскіх ліцэяў і мы самі нядаўна былі на сустрэчы ў гайнаўскай школе. Урокі ладзім у рамках розных мерапрыемстваў з улікам прапаноў настаўнікаў. На нашы ўрокі запрашаем гісторыкаў і археолагаў з Падляшскага музея ў Беластоку і іншых спецыялістаў, а з настаўнікамі дамаўляемся наконт тэрмінаў спатканняў.

— Ваш музей знаходзіцца ў гарадской ратушы XVIII стагоддзя і можа таму гарадскія ўлады рашыліся стылізаваць на даўні лад яе наваколле. Месца вельмі добрае для музейнай дзейнасці, але летам пайшлі чуткі, што ратуша можа быць выкарыстана ў іншы спосаб, чым на ваш музей. Ці вырашылася ўжо справа дзейнасці музея ў Бельску?

— Бельская ратуша гэта цудоўнае месца для нашага музея. Аднак у чэрвені гэтага года закончылася дамова на бясплатную арэнду памяшканняў ратушы. Зараз справа пралангацыі дамоўленасці на арэнду будынка ратушы для нашага музея на папярэдніх умовах апынулася на добрай дарозе.

— Вы з'яўляецеся выпускніцай Бельскага белліцэя. Ці цяпер часта паяўляецца нагода супрацоўнічаць са школай у якой Вы вучыліся?

— Мы часта запрашаем вучняў і настаўнікаў белліцэя да ўдзелу ў рэалізаваных намі праектах. Белліцэісты ахвотна прымаюць удзел у ладжаных намі мерапрыемствах, а настаўнікі дапытваюцца што могуць яшчэ зрабіць.

— Вы, як бяльшчанка з дзяцінства, напэўна радуецеся, што ў сваёй прафесійнай рабоце можаце так многа зрабіць для развіцця культуры ў родным горадзе. Ці па-за работай ёсць у Вас яшчэ час праяўляць актыўнасць у культурным жыцці Бельска?

— Я стараюся пабываць на выстаўках і іншых мерапрыемствах арганізаваных у Бельскім доме культуры, прымаю ўдзел у мерапрыемствах Музея малой айчыны, наведваю сустрэчы ў школах і іншыя культурныя імпрэзы. У гэтых выпадках прафесійную работу спалучаю з асабістым зацікаўленнем. Прыемна, калі людзі распазнаюць мяне ў горадзе і размаўляюць пра культуру.

— Ці ёсць можа ўжо ў музеі планы на рэалізацыю чарговых праектаў?

— Мы прадбачваем у 2008 годзе наладзіць экспазіцыю „Выстаўка адной вуліцы", на якой хочам паказаць усе будынкі распаложаныя ў мінулым па вуліцы Міцкевіча і прэзентаваць інфармацыю пра іх уласнікаў з міжваеннага перыяду, залежна ад матэрыялаў, якія ўдасца нам сабраць. Звяртаемся мы за дапамогай у справе збірання фатаграфій і інфармацыі з мінулага да жыхароў нашага горада і бачым зацікаўленне нашай ініцыятывай. Зараз пішам кніжку для дзетак „Марыся ідзе ў музей", каб з яе дапамогай яшчэ больш заахвоціць дзетак наведваць нашу ўстанову. Аднак у нашым музеі толькі два мерытарычныя працаўнікі (я і Кася Солуб) і сціплыя фінансы, што абмяжоўвае нашы планы.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

БЕЛАВЕЖА
Юбілей не за гарамі

Міра ЛУКША

Беларускаму літаратурнаму аб'яднанню „Белавежа" праз няцэлы год „стукне" паўстагоддзя ад дня заснавання яго пры рэдакцыі „Нівы" 8 чэрвеня 1958 года. Ужо заранёў пералічыць выпадае здабыткі гэтага найстарэйшага з дзейнічаючых у Польшчы творчых літаратурных згуртаванняў і яго паасобных сяброў, сярод якіх ёсць масцітыя і вядомыя літаратары, аўтары шматлікіх зборнікаў, дасягненні якіх вядомы не толькі на беларускім палетку. Выдалі аўтары „Белавежы" каля двухсот найменняў кніг не толькі пабеларуску, выпускаюць свой літаратурна-крытычны штогоднік „Тэрмапілы", у якім друкуюцца творы і даследчыцкія матэрыялы аўтараў таксама і з Беларусі, і шырэйшага свету. Пятае пакаленне сяброў гуртуе ўжо „Белавежа", паколькі прыемна ўбачыць на семінарах і іншых сустрэчах ды знаёміцца з творамі і першымі зборнікамі аўтараў узросту магчымых праўнукаў заснавальнікаў. Семінары калісьці былі сустрэчамі майстроў з маладзейшымі, свайго роду шкалярскімі майстар-класамі, досыць частымі, на якіх прапанаваліся і абмяркоўваліся новыя творы, прарочылася пра новыя шляхі. Цяпер яны найчасцей з'яўляюцца сяброўскай сустрэчай пры салодкім частунку, у час якога абмяркоўваюцца новыя выданні — ці то свежыя зборнікі паасобных аўтараў, ці змест штогоднікаў. Ёсць таксама нагоды для ўспамінаў — таксама пра тых сяброў-пісьменнікаў, якія адышлі ў іншасвет.

Чарговы семінар БЛА „Белавежа" склікаў яго старшыня Ян Чыквін 27 кастрычніка. На жаль, не ўсе сябры маглі на яго прыбыць, перш за ўсё па прычыне здароўя. Не хапала Сакрата Яновіча (які нядаўна адпакутаваў вельмі цяжкай хваробай і памаленьку папраўляецца), і аднаго з найстарэйшых „белавежцаў" Васіля Петручука; іх, дарэчы, далей ажыўляе творчы пал і чакаем іхніх новых твораў на старонках таксама і „Нівы". „Юбілей не за гарамі" — быў галоўны лозунг сустрэчы. На пачатак ліпеня 2008 года прапануецца ўрачыстая юбілейная двухдзённая сустрэча-семінар, на якім выступяць таксама і даследчыкі з замежжа (з Вялікабрытаніі, Нямеччыны, Беларусі), якія будуць абмяркоўваць плён творчасці сябрыны, „адзінай у Польшчы, якая мае такую трываласць" (Я. Чыквін). Як заўважыў старшыня, у Беларусі стварылася ўжо даследчыцкая школа, якая займаецца дасягненнямі беларускіх пісьменнікаў у Польшчы. Шмат матэрыялаў датычных гэтага семінара надрукавана ўжо ў юбілейнай кнізе „Шлях па прамой часу. 1958-2008", выдадзенай ужо сёлета з нагоды белавежскага юбілею (пісалася пра яе ў 43 нумары „Нівы"). Сустрэча праводзілася б пры мастацкім афармленні — з выступленнямі саміх аўтараў, з пастаноўкай на творы „белавежцаў" (варта было б, каб падрыхтаваў гэта нейкі школьны дэкламатарскі ці тэатральны калектыў, ці калектыў з песнямі на словы „белавежскіх" аўтараў).

— Трэба звярнуць увагу на тое, — сказала Галіна Твараповіч, —якое значэнне мае літаратура створаная беларусамі ў Польшчы. Курсы па творчасці „белавежцаў" чытаюцца практычна па ўсіх універсітэтах у Беларусі. Вывучэнне на універсітэцкім узроўні шмат значыць. І ў нас ва універсітэце чытаецца ўжо другі год курс „беларуская літаратура ў Польшчы", які канчаецца экзаменам. Гэта адбылося за 50 гадоў, дзякуючы Георгію Валкавыцкаму, што падкрэсліваю, стваральніку і «хроснаму бацьку „Белавежы"» і ўсяго беларускага літаратурнага руху ў Польшчы. Гэтая чарговая кніга — трэцяя частка падагульняючых выданняў. У 2000 годзе выйшла ў „Беларускім кнігазборы" кніга „Беларускія пісьменнікі Польшчы". Там былі творы семнаццаці аўтараў, тых, хто на той час меў выдадзеныя аўтарскія кнігі. Да 45-годдзя „Белавежы" выйшаў фотаальбом — гісторыя „Белавежы" ў фатаграфіі. Значыць, „Белавежа" мае сваю своеасаблівую трылогію. І гэта застанецца ў гісторыі, незалежна ад усяго іншага, ад палітычна-сацыяльных умоў, ад агульнай уніфікацыі ў свеце, — даробак сяброў „Белавежы" гэта аб'ектыўная рэальнасць, якая працуе на беларушчыну. Кніга „Шлях па прамой часу" гэта факт, і адкрытая прастора для далейшых даследаванняў. Важна, што і моладзь у нас ёсць, пераймальнікі, таленавітая моладзь.

— З нашых выданняў вынікае, што маем усе жанры ў творчасці, — не скрываў задавальнення Георгій Валкавыцкі. — Не хапала дагэтуль крытычных матэрыялаў. Маем ужо анталогіі прозы, сатыры, паэзіі, таксама Мінск адгукнуўся. Яшчэ ў шасцідзесятыя гады Быкаў, Караткевіч бачылі ў „Белавежы" штосьці новае, — новыя галасы, новыя манеры, надзею на адраджэнне. Не змарнавалі мы гэты час.

Пачатак XXI стагоддзя ўваходзіць у жыццё чалавецтва нівеляваннем межаў паміж віртуальнай і сапраўднай рэальнасцю. Інтэрнэт настолькі моцна ўплывае на наша жыццё, што мы не толькі выкарыстоўваем яго для пошукаў нейкай патрэбнай інфармацыі, але і для пошуку сяброў, аднадумцаў, а часам і для стварэння сям'і. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што такія пошукі прыводзяць да ўзнікнення інтэрнэт-таварыстваў ці інтэрнэт-суполак, куды ўваходзяць людзі, магчыма, ніколі адзін аднаго не бачыўшыя, але аб'яднаныя агульнымі інтарэсамі. Паколькі такая з'ява для Байнэта адносна новая, то і дакладнай назвы гэтыя віртуальныя групы не маюць. Як іх трапна будзе вызначыць — суполкі, таварыствы ці, не перакладаючы з англійскай, кам'юніці — пакажа час. А ў нашым артыкуле мы іх будзем называць суполкамі, тым больш, што менавіта такую назву прапануе сайт, на які сёння мы завітаем — United friends forever (Назаўсёды аб'яднаныя сябры).

Каб выйсці да „Аб'яднаных сяброў", трэба набраць на сваім камп'ютэры адрас сайта http://www.uff-by.org. Перад намі адкрыецца не надта аздобленае рознымі ўпрыгожаннямі выяўленне партала, які, аднак, вельмі насычаны самай разнастайнай інфармацыяй. Нягледзячы на разнастайнасць, мэтавая аўдыторыя ў сайта ёсць — гэта моладзь, аб чым распрацоўшчыкі рэсурса распавядаюць на старонцы „Пра нас", выйсце куды месціцца акурат пад назвай сайта зверху. „Uff-by.org, — пішуць яны, — гэта жывая інтэрактыўная вэб-старонка, якая адлюстроўвае ўвесь сьвет беларускае моладзі. Мы імкнемся распавесьці пра самыя цікавыя падзеі на Беларусі й за яе межамі, дапамагчы разабрацца з праблемамі, што Вас хвалююць, падаць матэрыял для роздуму й навучаньня, стварыць пляцоўку для выказваньня Вашых думак".

Менавіта ў такім запрашэнні да супрацоўніцтва дзеля агульных для данай суполкі інтарэсаў і паўстае кола віртуальных сяброў. Што ж тычыцца тэм, якія лічаць вартымі ўвагі беларускай моладзі невядомыя аўтары партала, то яны знаходзяцца ў рубрыках, што месцяцца на левым баку выяўлення. Рубрык вельмі многа, але вялікая колькасць артыкулаў, якія можна адначасова аднесці да некалькіх тэм, дублюецца на розных старонках. Адным з цікавых адрозненняў спіса рубрык на даным сайце ёсць тое, што размешчаны яны згодна алфавіту, а не па частаце абнаўлення ці большай важнасці.

Да гонару аўтараў сайта варта адзначыць, што матэрыялы на ім абнаўляюцца даволі аператыўна і з'яўляюцца актуальнымі, датычаць рэалій сённяшняга жыцця найбольш актыўнай часткі беларускай моладзі. Каб у гэтым упэўніцца, варта зазірнуць на старонкі „Студэнцкае жыццё" ці „Грамадства і эканоміка", дзе мноства артыкулаў прама ці ўскосна закранаюць маладзёжную тэму.

Паколькі распрацоўшчыкам і натхняльнікам сайта вельмі залежыць, каб аўтараў на партале станавілася ўсё больш, то рубрыка „Аўтарскі матэрыял" размешчана з двух бакоў выяўлення. У другой — правай — адразу падаюцца і назвы артыкулаў. Ну а каб далучыць свой тэкст да размешчаных ужо на сайце, трэба зазірнуць на старонку „Дашлі артыкул", выйсце куды месціцца ўверсе выяўлення, і адаслаць яго на электронную пошту згодна абранай тэматыцы.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Крок назад

Фінішаваў 17-ы чэмпіянат Беларусі па футболе. Канцоўка яго была надзвычай напружанай у змаганні за другое і трэцяе месца, на якое прэтэндавалі ажно чатыры спаборнікі. У выніку першынства каманды размясціліся наступным чынам: 1) БАТЭ (Барысаў) — 56 ачкоў; 2) „Гомель" — 44; 3) „Шахцёр" (Салігорск) — 44; 4) „Тарпеда" (Жодзіна) — 43; 5) МТЗ РІПА (Мінск) — 42; 6) „Нёман" (Гродна) — 36; 7) „Нафтан" (Наваполацк) — 36; 8) ФК „Віцебск" — 35; 9) „Дынама" (Мінск) — 35; 10) „Смаргонь" — 26; 11) „Дарыда" (Ждановічы) — 25; 12) „Дынама" (Брэст) — 25; 13) „Днепр" (Магілёў) — 23; 14) ФК „Мінск" — 21.

Барысаўскі БАТЭ ажно за тры туры да завяршэння турнірнай дыстанцыі забяспечыў сабе чарговы чэмпіёнскі тытул, перамогшы другі год запар, чаго не здаралася вельмі даўно — з часоў гегемоніі мінскага „Дынама". Працягнулася звыклая традыцыя — БАТЭ зноў з медалямі — 9-ы раз з 10 сезонаў (!). Вышэйшая справядлівасць бачыцца ў тым, што на п'едэстал узышлі найбольш выніковыя каманды: барысаўцы і гомельцы забілі па 49 мячоў, салігорцы — 41. Гэта намнога больш чым іншыя ўдзельнікі, так што канцовыя вынікі паслужылі гімнам атацы. Сенсацыйным адкрыццём чэмпіянату стала жодзінскае „Тарпеда". Каманда, якой адводзілі ролю запіснога аўтсайдэра, да апошняга тура прэтэндавала на медалі. У заключнай гульні жодзінцы, хоць фінішны пасьянс урэшце расклаўся і не на іх карысць, адолелі МТЗ, выбіўшы аднаго з фаварытаў з прызёраў.

А вось з гродзенскім „Нёманам", які радаваў сваіх заўзятараў у першым крузе высокай выніковасцю, у другой палове першынства здарылася дзіўная метамарфоза. Каманда рэгулярна забірала пункты ў моцных сапернікаў, але транжырыла каштоўныя ачкі ў паядынках з апрыёры слабейшымі. Маючы напрыканцы цудоўны расклад гульняў, нёманцы бяздарна ўпусцілі свае шанцы. Застаецца спадзявацца, што галоўнаму трэнеру Людасу Румбуцісу па сумнай гродзенскай завядзёнцы не пакажуць на дзверы, а дадуць магчымасць спакойна працаваць у наступным сезоне.

Зусім няўдала правялі чэмпіянат дынамаўскія калектывы — брэсцкія футбалісты пасля заваёвы кубка сталі поўнымі статыстамі ў чэмпіянаце, а заняпад колішняга флагмана айчыннага футбола — сталічнага „Дынама" (9-е месца, найбольш нізкае ў суверэннай гісторыі) абумоўлены палітыкай перманентнай кадравай „зачысткі", якую праводзіць гаспадар клуба Юрый Чыж.

Лепшым бамбардырам чэмпіянату стаў Раман Васілюк з „Гомеля" — на яго стралецкім балансе 24 забітыя галы, 18 разоў вызначаўся Генадзь Блізнюк, 15 — Віталь Радзівонаў (абодва форварды з БАТЭ), 14 — лепшы снайпер нацыянальнага футбола Валерый Стрыпейкіс („Гомель"). Для параўнання лепшыя бамбардыры чэмпіянату Расіі забілі толькі па 14 мячоў, да таго ж у чэмпіянаце суседзяў гулялі 16 клубаў. На наступны год беларуская вышэйшая ліга таксама вяртаецца да ранейшага фармату і пашыраецца да 16 удзельнікаў. Мацнейшы дывізіён пакіне толькі „Мінск", а эліту дапоўніць трыо — магілёўскі „Савіт", „Граніт" з Мікашэвічаў і сталічны „Лакаматыў". Першыя двое — чыстай вады дэбютанты, а „чыгуначнікі" ўжо выступалі ў вышэйшым свеце. У кожным разе наўрад ці такое пашырэнне станоўча адаб'ецца на роўні чэмпіянату; хутчэй за ўсё наадварот. Сутнасць павелічэння, якое стане крокам назад, палягае найперш у фінансавых інтарэсах тых, хто мае дачыненне да правядзення чэмпіянату.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Размовы ў вагоне

Уладзімір СІДАРУК

28 кастрычніка. Нядзеля. Ранішні цягнік з Чаромхі ў Высока-Літоўск адпраўляецца ў 8^{30}. На станцыю дабіраюся на ровары. Перад вакзалам прыкмячаю групку дзетак з рэчавымі мяшкамі. Гэта ўдзельнікі II Адкрытага чэмпіянату ў плаванні „Залатая восень", якія вяртаюцца з Бельска-Падляшскага ў Беларусь. Каля білетнай касы сустрэў я Віктара Кердалевіча з Кляшчэляў, які калісьці працаваў у пякарні. Спалучала нас сардэчнае сяброўства, паколькі Віктар — муж маёй пляменніцы, Тоні Сідаручкі. Праводзіў ён дзядзьку, які ў іх гасцяваў, у Брэст. Барыс — мой дваюрадны брат, але кантактаў мы не падтрымліваем, паколькі нашы бацькі былі зводнымі братамі. У рэйкавым аўтобусе займаю месца побач сваякоў. Размова была кароткай і нечакана абарвалася. Братуха не праяўляў волі яе падтрымліваць, дык я рашыў пагаварыць з беларускімі плыўцамі.

— Адкуль будзеце? — пытаю рослага мужчыну, які казаўся быць апекуном групы.

— Са Светлагорска...

Калі я адрэкамендаваўся і заявіў, што хачу напісаць у „Ніву", мужчына пацікавіўся што гэта за газета і дзе выдаецца. Ягоны сябра заявіў, што прыходзілася яму бачыць „Ніву", і тады ён з ветлівай усмешкай згадзіўся на размову.

— Са Светлагорска выязджалі мы ў чацвер, 25-га, а ў суботу выступалі на II адкрытым Чэмпіянаце па плаванні ў Бельску-Падляшскім. Выступала сем каманд: чатыры польскіх, адна літоўская і дзве з Беларусі. Прыехалі па запрашэнні прэзідэнта клуба „Воднік" Валерыя Васільевіча Мяшчаракова...

У час далейшай размовы мой суразмоўца, а быў ім Сяргей Маконда, заявіў, што іхняя каманда на спаборніцтвах займала другія і трэція месцы. Удзельнікі чэмпіянату гэта вучні дзіцячай спартыўнай школы ў Светлагорску. У Польшчы гасцявалі яны ўпершыню.

Фота Уладзіміра Сідарука

Тамара Лаўрэнчук з дзядзькам Аляксандрам Сахарчуком

— Якія вашы ўражанні?

— Надзвычайныя. Добрыя ўспаміны застануцца. Начавалі мы ў школьным інтэрнаце, кармілі нас добра, прымалі вельмі гасцінна...

Пашпартны кантроль на беларускім баку пачаўся на раз'ездзе ў Голі, ды замаруджваўся, паколькі пашпарты правяраў адзін пагранічнік (у асноўным правяраюць двух). Але ў Высока-Літоўск прыехалі мы да ад'езду дызельнага цягніка ў Брэст. Пасажыры рэйкавага аўтобуса паспелі. Ды і я зрабіў закупку на беларускім баку.

Праз няпоўную гадзінку вяртаўся я дамоў. Кампанію састаўлялі мне чаромхаўскія чаўнакі і беларускія турысты. Побач мяне заняла месца рослая жанчына з прысівелымі валасамі. Што і раз спаглядала яна ў мой бок.

— Пэўна мяне не пазналі, спадар Сідарук, — адазвалася суседка. — Нядаўна вы гасцявалі ў майго дзядзькі ў Чаромсе...

— Тамара?..

— Ва ўласнай асобе, — адказала яна з усмешкай.

З Тамарай Лаўрэнчук, настаўніцай-пенсіянеркай з Высокага (друкавала яна свае допісы ў „Ніве") пазнаёміўся я ў Чаромсе на кватэры Аляксанра Сахарчука, дзядзечкі маёй спадарожніцы. Падарыў я тады ёй чатыры кніжкі на беларускай мове, а яна мне ўзамен — кнігу „Забытых таямніцаў чар" і дзесяць экземпляраў часопіса „Па-суседску". Разам у кампаніі спадарожнічалі сяброўкі спадарыні Лаўрэнчук, якім яна адрэкамендавала мяне як карэспандэнта „Нівы". У час далейшай размовы прапанавала яна спаткацца пры чарговым застоллі. Я падтрымаў яе ідэю. Пасля пашпартна-мытнага кантролю мы развіталіся на чыгуначнай станцыі ў Чаромсе з надзеяй на хуткую сустрэчу. Спадарыня Лаўрэнчук са знаёмым падалася на аўтамабілі да дачкі ў Гайнаўку, а я — поўны ўражанняў — дамоў у Кузаву.

Чырвоная рабіна

Чырвоным полымем кожную восень гараць ягады рабіны. Для чалавека яны вельмі карысныя і здаровыя. Рабінавыя плады маюць мноства сарбіту, які для дыябетыкаў замяняе цукар. Жалеза ў рабіне 4 разы больш, чым у яблыках, таму яна рэкамендуецца цяжарным жанчынам і маленькім дзецям, калі не маюць алергіі да рабіны.

У рабінавых ягадах знаходзяцца рэчывы, якія памагаюць пры неўрозах і кіслародным галаданні. Вельмі важна, што рабіну выкарыстоўваюць пры лячэнні хвароб, звязаных з павышанай радыяцыяй. Рабінавы пектын дапамагае выводзіць з арганізма солі цяжкіх металаў. Дзякуючы комплексу актыўных біялагічных рэчываў рабіна ўрэгулёўвае абмен солей, тлушчаў і халестэрыну ды з'яўляецца антысклератычным сродкам. Кіслата рабіны тармозіць парост шкодных мікраарганізмаў — грыбоў і плесені. Таму, калі дасыпаць ягад да марынадаў, яны даўжэй не псуюцца. Калі лістком рабіны пералажыць бульбу, моркву ці іншую агародніну ў склепе, яна цэлы год не будзе псавацца. Вось якая карысная рабіна.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Цукеркі замест гарэлкі

Ёсць на Брэстчыне такі гарадок, як Маларыта. А ў тым горадзе, як і ў любым іншым, ёсць вінныя крамы. Дык вось, з нядаўняга часу ў тых крамах на бутэльках з віном і гарэлкай з'явіліся незвычайныя налепкі: „Хто не паліць і не п'е — той фінансы сцеражэ", „Мы з манетаў зладзім бомкі — на цукеркі для малятаў і на футрачка для жонкі", „Калі кінеш цыгарэту — цябе ўхваліць дзед за гэта", „Не пі з рыльца ты нагбом — інакш зробішся казлом!"

Такім арыгінальным чынам навучэнцы профільнага класа Міністэрства па надзвычайных становішчах СШ № 1 г. Маларыты праводзяць акцыю „Дзеці супраць алкаголю". Дарэчы, мясцовы гандаль да такіх навацыяў ставіцца станоўча. Ёсць спадзеў на тое, што і сярод пакупнікоў — заўзятараў „падагрэўнай" прадукцыі — нехта задумаецца аб непапраўнай шкодзе алкаголю.

Тодар ЛЕНСКІ

Якое будзе надвор'е ў 2008 годзе?

Калі хочаце ведаць, якое будзе надвор'е ў 2008 годзе, уважліва сачыце за ім пачынаючы ад 12 снежня 2007 года. Якраз гэты дзень — цэлыя суткі — абазначае пагоду на студзень 2008 года, а 12 гадзіна дня — абазначае палову месяца. Трэба штодзённа вельмі дакладна запісваць стан надвор'я, бо кожны наступны дзень абазначае пагоду на наступныя месяцы 2008 года. Запісваць трэба аж да 23 снежня 2007 г., бо надвор'е ў гэты дзень будзе абазначаць пагоду на снежань 2008 года.

Усё гэта чуў я не адзін раз ад старажылаў, якія ўжо адышлі ў вечную дарогу.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	
	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	32	33	34	35	
		36	37	38	39	40	41	42	43	44	45	46	47	48	49	50		
									51	52	53	54	55	56	57	58		

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Уінстана Чэрчыля.

1. Мікалай, савецкі лаўрэат нобелеўскай прэміі па фізіцы за 1964 год = 19 _ 52 _ 25 _ 29 _ 24 _;

2. жанчына з Адамавай скабы = 23 _ 21 _ 22 _;

3. харчовы прадукт з печані, лёгкіх, сэрца або селязёнкі забойнай жывёлы = 3 _ 4 _ 1 _ 53 _ 54 _;

4. хлусня = 13 _ 12 _ 33 _ 55 _;

5. Іван, аўтар „Людзей на балоце" = 30 _ 32 _ 31 _ 35 _14 _ ;

6. процілегласць максімуму = 43 _ 44 _ 34 _ 6 _ 7 _ 8 _ 51 _;

7. чарнаморскі курорт для зімовай алімпіяды ў 2014 г. = 41 _ 38 _ 39 _ 20 _;

8. скрынка для памерлага = 37 _ 47 _ 46 _ 49 _ 42 _;

9. расліна сямейства складанакветкавых, якой сушанае карэнне дадаецца ў каву для смаку і паху (*Cichorium intybus*) = 16 _ 15 _ 11 _ 10 _ 9 _ 57 _ 2 _;

10. сабачка = 17 _ 58 _ 56 _ 50 _ 5 _ 40 _;

11. Віктар, беларускі „скандынаўскі" паэт = 36 _ 26 _ 27 _ 28 _;

12. ежа = 18 _ 45 _ 48 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 41 нумара

Растоў, азот, магній, херас, тхор, мур, панцыр, праказа, хлеў.

Рашэнне: **Той мае, хто ў руках трымае.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Наклад: 1 684 egz.

Суседскія былі

НІМБЫ ДЛЯ ПРАВІЛЬНЫХ

Віктар САЗОНАЎ

Напачатку Адаму Хвастову для поўнага шчасця не хапала толькі грошай. Ён прынамсі ў гэтым быў упэўнены больш, чым яго школьны настаўнік матэматыкі ў тым, што два дадаць два будзе чатыры. Адам быў малады, здаровы, высокі, прыгожы, упэўнены ў сабе, працавіты, вясёлы, не піў, не курыў, не меў кепскіх звычак і сувязей. Ажно суседзі дзівіліся, чаму над яго кучаравай патыліцай яшчэ не запаліўся німб, што прыводзіла людзей да сумневу ў тым, што німбы ўвогуле існуюць. Прэтэндэнтак стаць міс Хвастовай таксама было больш, чым незамужніх дзяўчат у яго горадзе. Але Адам не мог дазволіць сабе павесіць на шыю кабету, якая яшчэ і дзяцей яму панараджае, усё па той жа банальнай прычыне — ён не ведаў за якія грошы ўдасца іх пракарміць. Таму найперспектыўнейшы жаніх на ўсёй заходняй Беларусі, уключаючы таксама і ўсходнія землі і землі этнічнага расселення беларускага этнасу, а таксама ўсе тэрыторыі, на якіх жыве беларуская дыяспара, найперш вырашыў разбагацець. Для гэтага ён выбраў самы складаны шлях — бізнес. Працаваў шмат і актыўна. І праз дзесяць год ён, на заднім сядзенні ўласнага шасцісотага „Мерседэса", якім кіраваў яго ўласны шафёр, разважаў пра тое, што не можа жаніцца і зараз, бо бракуе часу на такія рэчы. Справа забірала ўсё. І час, і сілы, і здароўе, і думкі, і мары, і надзеі. Цяпер грошай было як у некалькіх банкіраў разам узятых, а шчасце ўсё адно не спяшалася завітаць у яго двухпавярховы катэдж з высокім плотам, сігналізацыяй, аховай, прыслугай і срэбнымі сталовымі прыборамі. Да яго ў госці завітвалі кіраўнікі горада, начальнікі падатковай інспекцыі, калегі па бізнесе, генералы міліцыі і іншых службаў, але гэта не вырашала праблемаў з адзінотай і роспаччу. Таму Адам вырашыў, што трэба ўзяць невялічкі адпачынак і ўладкаваць асабістае жыццё.

На пасаду спадарыні Хвастовай сябры яму параілі Аліну Сямашку, прыгожую і разумную бландзінку, якая па сумяшчальніцтве была выхавацелем ды псіхолагам і распавядала студэнтам пра веліч аскетычнага вобразу жыцця. Яе лекцыі былі настолькі пранікнутыя ідэямі стрыманасці ды ўстрымання, што німб павінен быў ззяць над яе галавой яшчэ ярчэй, чым у Адама дзесяць гадоў таму. Святары ды манахі маглі б павучыцца ў гэтага чалавека даводзіць да аўдыторыі вялікія ідэі правільнага жыццёвага выбару. А аскеты ўсіх краін, калі б даведаліся, што ёсць такая кабета, мусілі б аб'яднацца і вылучыць Аліну на Нобелеўскую прэмію за самаахвярнасць. Ды і арганізатары той прэміі таксама мусілі б увесці гэтую новую намінацыю, першым лаўрэатам якой без сумневу стала б Сямашка.

Гэтыя якасці прэтэндэнткі на званне мамы дзяцей Хвастова былі вельмі даспадобы Адаму. На першым спатканні ён нават прыкінуўся сціплым чыноўнікам аддзела кадраў завода „Аўтаагрэгатаў" з заробкам ніжэй сярэдняга пражыткавага мінімуму, у якога няма ўласнага кута і якіх-небудзь перспектыў разбагацець. Хацеў праверыць шчырасць паводзін сваёй каханай. Але дзяўчыне было ўсё роўна. Адам ёй вельмі спадабаўся і яна закахалася ў яго з першага позірку. Казала, што шчасце не ў грашах, што іх шлюб будзе шчаслівы і вечны, і толькі смерць, не важна нават калі і ад голаду, зможа іх раз'яднаць.

Адам быў на сёмым небе ад шчасця. Ён знайшоў тое, што яму трэба, і ў яго было ўсё, каб гэтае ашчаслівіць, паколькі пра такую прыгожую, сціплую і сумленную жанчыну мараць кожны мужчына. Але не кожны можа даць ёй тое, што можа ён. Хвастоў нават пачаў камплексаваць са свайго багацця. Баяўся, што гэтая аскетычная мілая жанчына можа адмовіць яму з-за таго, што ён нават не ведае, колькі соцень тысяч купюр у валюце розных краін свету ляжыць у яго хатнім сейфе.

На адным са спатканняў Адам падарыў ёй залатое калье з нейкім дарагім каменьчыкам. Аліна была вельмі ўсхваляваная і шчаслівая. Праўда, папракнула свайго абранніка, што выкідваць грошы на ўпрыгожанні не правільны падыход да жыцця. Але як даведалася пра сапраўдны фінансавы стан кіраўніка трох буйных фірмаў, толькі крыху збянтэжылася і сказала, што самыя па сабе грошы не ёсць зло. Дзякуючы ім можна зрабіць безліч добрых спраў. Асабіста ёй, маўляў, яны не вельмі патрэбныя. І яна будзе іх браць толькі на самае неабходнае.

Напачатку самым неабходным стала норкавая шуба, якая магла ўратаваць ад холаду зімой. Яшчэ нейкія замежныя боты і пара-тройка дробязей. Падарункі са шляхетных металаў і не менш шляхетных камянёў былі ініцыятывай Адама. Гэтак жа, як і грошы на кішэнныя расходы ў памеры трох-чатырох месячных заробкаў выхавацеля, якія выхавацелька атрымлівала штодзённа. Крыху пазней самым неабходным сталі вячэры ў самых дарагіх рэстаранах горада. А праз паўгода Аліна не магла вынесці таго факту, што яна вельмі мала часу бачыцца са сваім каханым, бо шмат часу губляе на дарогу ў грамадскім транспарце. Таму самым неабходным стаў новенькі аўтамабіль „БМВ". Але і ён не вырашыў праблемаў з часам і Сямашка прыняла рашэнне кінуць працу і з тае прычыны павялічыць кішэнныя расходы ў тры разы.

Справа пацыху набліжалася да вяселля. Адаму вельмі хацелася зрабіць сваёй каханай эфектны шлюбны падарунак. Ён спытаў яе, што б яна хацела. Дзяўчына ўжо ведала што. Гэта быў круіз па Міжземным моры на параходзе, які плаўна перарастаў у наведванне карнавалу ў Рыо-дэ-Жанейра, каб адпачыць ад вясельных клопатаў, а пасля вылет самалётам у Аўстралію, каб адпачыць ад карнавалу. Пры гэтым кабета не забылася заказаць дзесятак-другі камплектаў адзення для падарожжа і невялічкую кучку дарагіх упрыгожанняў, але выключна толькі для таго, каб Адаму не было сорамна, што жонкі ўсялякіх там Фордаў ды Ракфелераў выглядаюць больш эфектна, чым яго абранніца. А там, падчас падарожжа, яна прыгледзіць сабе які-небудзь сапраўды варты падарунак.

Адам доўга разважаў пасля гэтага так, як разважаюць мысліцелі-філосафы над тым, што такое добра і што такое блага. У канцы размовы са сваімі думкамі ён прыйшоў да высновы, што калі так пойдзе далей, то вельмі хутка для поўнага шчасця яму будзе не хапаць толькі грошай. Таму вяселле не адбылося. Хвастоў зноў залез з галавой у бізнесовыя справы, а Аліна вярнулася на сваю былую працу і стала як у былыя добрыя часы апавядаць студэнтам пра веліч аскетычнага вобразу жыцця. Праўда, яе лекцыі не перашкаджалі ёй з'яўляцца на людзях у норкавай шубе, залатых ланцужках і пярсцёнках, ды на новенькім „БМВ".

А суседзі Адама ды Аліны і іншыя іх знаёмыя пачалі абмяркоўваць тэму німбаў. Казалі, што гэта вельмі правільна, што німбы не запальваюцца над галовамі правільных людзей, бо не вядома як яны будуць жыць крыху пазней.

18.11 – 24.11

Баран (22.03. — 20.04.) Ажыццявіш без цяжкасцей усе свае ідэі. Усе твае рашэнні будуць слушнымі. Інстынкт цябе не падвядзе! 18-22.11. — гучныя спрэчкі з партнёрам; доўга на сябе не будзеце дуцца, паяднае вас жарсць.

Бык (21.04. — 21.05.) Будзеш асабліва сварлівы. Цяжка будзе з кампрамісам, таму не плануй ніякіх перагавораў, а падпісванне дамоў адтэрмінуй на больш спрыяльны час. Пад уплывам новага знаёмства схочаш змяніцца.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Спраўнасць розуму, інтэлігентнасць і проста геніяльныя ідэі могуць памагчы ўзабрацца табе на пару прыступак вышэй у жыцці. З 17.11. пагрозы для твайго здароўя. Не гуляй небяспечна, бо цяжка ўсё будзе гаіцца.

Рак (23.06. — 23.07.) Да 19.11. поспехі ў навуцы. З 19.11. не прымяняй ніякіх цуд-дыетаў, бо пасля хутка папаўнееш. 24.11. (поўня Месяца) цяжкі настрой (хутка міне). Файныя і займальныя сустрэчы з раднёй і сябрамі.

Леў (24.07. — 23.08.) Мілая кампанія сяброў паможа забыць табе на ўсе клопаты і паразы. Крыху нуднавата ў сям'і (манатоннасць паслабляе сувязі). Не гуляй у дыктатара з партнёрам, бо пачне табе маніць, зводзіць, аж урэшце пазбягаць. Лепшыя грошы за ўзорную працу.

Дзева (24.08. — 23.09.) Захопіш усіх сваімі ведамі, будзеш ззяць у атачэнні. Будзеш улюбёнцам знаёмых і душой кампаніі. 17-21.11. лепш трымай язык за зубамі, не ляпні чаго, бо пасля магчыма адплата. З 22.11. кіраванне мроямі і жаданнямі можа цябе моцна расчараваць.

Шалі (24.09. — 23.10.) Да 20.11. будзеш мець нагоды зрабіць усё пасвойму. Будзь адкрытым на новыя магчымасці, бо лёс нясе табе новыя шанцы. З 21.11. будзеш лішне пабуджаны і перавялічыш шмат праблем.

Скарпіён 24.10. — 22.11.) Зайздрасць і падазронасць партнёра могуць папсаваць табе жыццё. На працы шмат дасягненняў, некаторыя заслужаныя, іншыя ўпадуць табе як манна з неба. Часам варта ўступіць, чым змагацца з працаўнікам.

Стралец (23.11. — 22.12.) Будзеш ажыўлены, жыццярадасны, поўны запалу да працы. Чакаюць цябе поспехі, справішся з кожным выклікам. З 23.11. магчымыя страты з-за невыканання абяцанняў.

Казярог (23.12. — 20.01.) Да 19.11. добры час для перагавораў, важных пакупак, інвестыцый. Адпачні ад партнёра, каб пасля за ім патужыць. Не абцяжарвайся празмернымі абавязкамі. Калі ў цябе шмат поспехаў, гэта не значыць, што ты лепшы ад іншых.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Да 21.11. магчымыя паразы. Не кіруйся стэрэатыпамі. Бяры справы якія яны ёсць і нічога не змяняй насілу. Не на ўсе змены ў пачуццёвым жыцці ты гатовы.

Рыбы (20.02. — 21.03.) З 22.11. праблемы ў міжлюдскіх адносінах, асабліва службовых. Разлічвай выключна на сябе, бо трапіш у кабалу. Не хапай сарака сарок за хвост. Варта было б змяніць месца прабывання. Трымайся здалёк ад малавядомых асоб.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Расстраляныя - III

Ніва
ПРА ГІСТОРЫЮ

Павел Грэсь - IV

Родам з Беласточчыны

Слуцкі паўстанец з Сакольшчыны

Сяргей ЧЫГРЫН

Беларускія гісторыкі, якія пісалі і пішуць пра збройны чын у барацьбе за незалежнасць Беларусі — Слуцкае антыбальшавіцкае паўстанне 1920 года, да сваіх даследаванняў заўсёды стараюцца дадаць адзін вельмі цікавы фотаздымак-дакумент. Гэты фотаздымак зроблены ў Вільні ў 1921 годзе. На ім сфатаграфаваны сцяг Першага Слуцкага палка стральцоў збройных сілаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Каля штандара (злева направа) сядзіць Лявон Вітан-Дубейкаўскі і невядомая беларуская дзяячка, а справа побач каля сцяга стаіць не хто іншы, як Антон Борык. Менавіта пра яго хачу сёння згадаць, хаця звестак пра нашага змагара за волю беларускага народа вельмі мала. У кнізе „Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах" (Мінск 2006) пра Антона Борыка найбольш прыгадвае гісторык Уладзімір Ляхоўскі. Часам спасылаецца на „Referat działacza politycznego Białorusi Antoniego Boryka z Wilna" Алег Латышонак у сваёй сур'ёзнай манаграфіі „Białoruskie formacje wojskowe 1917-1923" (Беласток 1995).

Упершыню прозвішча Борыка я сустрэў у артыкуле пра Слуцкае паўстанне Анатоля Грыцкевіча ў часопісе „Спадчына" за 1993 год, дзе ён пісаў: „Борык, капітан, — начальнік штаба 1-е Слуцкае брыгады стральцоў БНР" („Спадчына", № 2, 1993). Вось і ўсё бадай. Але чым больш нашы гісторыкі будуць даследаваць Слуцкае паўстанне і БНР, тым часцей будуць звяртацца да асобы Антона Борыка — загадкавай, мужнай, хітрай. Яго нават звольнілі ў лістападзе 1919 года з усіх пасад ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі за тое, што нібыта ён меў палітычныя сувязі з прадстаўнікамі польскай вайсковай арганізацыі. Але як бы там не было, беларус з Сакольскага павета Антон Борык да канца свайго жыцця быў шчырым беларусам і змагаром за незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны. У 1920 годзе ён узначаліў штаб Першай Слуцкай брыгады ў барацьбе супраць бальшавікоў.

Нарадзіўся Антон Борык у 1897 годзе ў вёсцы Сынкоўцы на Беласточчыне. Па іншых звестках ён нарадзіўся ў 1894 годзе. Калі пачалася першая сусветная вайна, Антона забралі на фронт, дзе ён даслужыўся да капітана. На фронце беларускі юнак набраўся армейскага вопыту і смеласці, таму пасля вайны з 1917 года працягваў службу ў польскім корпусе генерала Доўбар-Мусніцкага.

У 1918 годзе Антон Борык вырашыў развітацца з вайсковай службай. Ён прыехаў у Вільню і адразу ўключыўся ў беларускую справу. Антона залічылі ў склад Віленскай беларускай рады. Ён актыўна ўключыўся ў работу і разам са сваімі сябрамі арганізаваў Беларускі нацыянальны камітэт у Гродне і ўступіў у Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

У 1919 годзе нашага земляка ўключаюць у склад супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў БНР. Урад накіроўвае Борыка ў Берлін. Ён быў першым урадавым пасланнікам БНР у гэтай краіне. Капітан Антон Борык прыбыў у Берлін з Гродна 23 сакавіка 1919 года ў якасці кіраўніка Беларускае ваеннае місіі па справах ваеннапалонных. Тое, што першым у Нямеччыну ўрадам БНР быў пасланы вайсковы прадстаўнік, зусім невыпадкова. Пытаннем жыцця і смерці для маладой беларускай дзяржавы было стварэнне ўласных узброеных сіл, якія б здолелі абараніць незалежнасць Беларусі ад акупантаў, што навальваліся на краіну з Усходу і з Захаду. У нямецкіх лагерах для ваеннапалонных знаходзілася каля 60 000 беларусаў. З іх дапамогаю беларускі ўрад спадзяваўся сфармаваць вайсковыя аддзелы, якія б пазней змаглі скласці ядро нацыянальнага войска. Ужо ў пачатку красавіка Антон Борык, наладзіўшы сувязь з Міжнароднай камісіяй па справах ваеннапалонных (дзейнічала пад эгідаю краін Антанты), актыўна вядзе беларускую працу сярод вайскоўцаў-суайчыннікаў. У гэтай справе яму дапамагаў генерал Кіпрыян Кандратовіч, які прыехаў у нямецкую сталіцу яшчэ ў лютым 1919 года і ў якасці сябра дэлегацыі БНР праз нейкі час мусіў адбыць на Парыжскую мірную міжнародную канферэнцыю.

Антон Борык

Дзейнасць беларускага ўрада ў іншых накірунках была больш выніковаю. Хутка там усталяваліся шчыльныя кантакты з прадпрымальнікам, выхадцам з Беларусі Станіславам Львом Сапегам-Ваяводам, які, маючы надзею наладзіць выгадныя гандлёвыя сувязі з Беларуссю, стварае ўласную фірму — „Сіндыкат Сапегі для Еўропы і Азіі на Беларусі". Пэўны час ён аказвае прадстаўніцтвам беларускага ўрада ў Берліне пасільную фінансавую дапамогу. У складзе Берлінскае канторы „Сіндыкату Сапегі..." працавала шмат беларусаў, у тым ліку паўнамоцным дырэктарам яе да лета 1920 года быў Антон Борык. Станіслаў Сапега-Ваявода стаў заснавальнікам першае за межамі былой Расійскай імперыі Беларускае службы друку і тэлеграфнае інфармацыі, якая двойчы на тыдзень выдавала інфармацыйныя бюлетэні, дзе галоўная ўвага надавалася беларускай тэматыцы.

Каля сцягу (злева направа) Лявон Вітан-Дубейкаўскі, невядомая жанчына і штабс-капітан Антон Борык. Вільня, 1921 год.

Афіцыйная рэгістрацыя Дыпламатычнае місіі БНР у Нямеччыне была зроблена Антонам Луцкевічам. 4 траўня 1919 года ён звярнуўся ў Міністэрства замежных спраў Нямеччыны з наступнай заявай: «Гэтым сьведчыцца, што ў склад Дыпляматычнай Місіі Беларускай Народнай Рэспублікі, якая ў гэты час знаходзіцца ў Бэрліне, уваходзяць наступныя асобы: старшыня Рады Народных Міністраў і Міністр Загранічных Спраў — Антон Луцкевіч; пасол — Аркадзь Смоліч; служачыя — Антон Борык і Янка Натусевіч".

Восенню 1919 года Надзвычайная дыпламатычная місія БНР у Нямеччыне складалася ўжо з трох аддзелаў (консульскага, ваеннага і аддзела прэсы) ды наступных асоб:

1. Шэф Місіі — Леанард Заяц (пазней Леанід Баркоў);
2. Сакратар — доктар Паўлоўскі;
3. Юрысконсульт — Бруно Мілер (консульскі аддзел);
4. Начальнік ваеннага аддзела Місіі — Антон Борык;
5. Райца па вайсковых справах — Яўхім Бялевіч (ваенны аддзел);
6. Райца па справах прэсы — Валянцін фон Дзітман.

У Германіі Антон Борык разам з іншымі беларусамі вырашае не толькі вайсковыя пытанні, але не шкадуе грошай для беларускіх дзетак, аказваючы вялікую фінансавую дапамогу беларускім школам у Мінску.

У сярэдзіне лета 1920 года Антон Борык пакідае Берлін і вяртаецца ў Латвію. Яго па-ранейшаму хвалююць беларускія справы і па запрашэнню беларускіх вайскоўцаў восенню таго ж года ён спыняецца ў Вільні, а пасля ў Гродне. Вярнуўшыся дамоў, наш зямляк узначаліў агульны аддзел Беларускай вайсковай камісіі. А восенню разам з групаю беларускіх афіцэраў капітан Борык накіраваўся ў Слуцк, дзе ўзначаліў штаб Першай Слуцкай брыгады. Актыўна папаўняў сваю брыгаду мясцовымі паўстанцамі і не вельмі сябраваў са Станіславам Булак-Булаховічам, выступаў супраць альянсу слуцкіх паўстанцаў з яго войскам. Антон Борык зрэдчас даваў інфармацыі ў газету „Наша думка" (выходзіла ў Вільні са снежня 1920 па ліпень 1921 гг.) і ў газету „Беларускае слова" (выходзіла з кастрычніка 1920 па студзень 1921 гг. і выдавалася Беларускім нацыянальным камітэтам Гродзеншчыны). Начальнік штаба беларускіх паўстанцаў паведамляў: „Беларускае паўстаньне маець партызанскі характар. У ім ёсьць тутэйшыя сяляне, „зялёныя" і дэзэртыры з Чырвонай Арміі. Бальшавікі стараюцца скрыць яго істнаваньне і давяць вялікарасейскімі аддзеламі. Паўстаньне пашыраецца па ўсіх беларускіх паветах, нягледзячы на недахват броні і агульнай помачы" („Наша думка", 24 снежня 1920 г.).

Калі ў канцы снежня 1920 года паўстанне было задушана, атрады паўстанцаў перайшлі на тэрыторыю Польшчы і былі раззброеныя і інтэрнаваныя ў лагеры ў Беластоку, а пасля — у лагеры ў Дарагуску. Антон Борык спачатку знаходзіўся ў Латвіі, пасля ў Коўне, Вільні, Варшаве. Дарэчы, у Варшаве ён быў адным з арганізатараў Таварыства беларускай школы. Перад самым пачаткам другой сусветнай вайны наш зямляк жыў у Вільні, працаваў у кіраўніцтве Віленскай чыгункі. Сляды яго губляюцца ў час вайны. Магчыма ён загінуў падчас акупацыі ў пачатку 1940-х гадоў.

Старонкі тутэйшай і сусветнай гісторыі

Забыты подзвіг — бой пад Мастамі

Язэп ПАЛУБЯТКА

Лёсавызначальны бой

1920 год. „Чырвоныя” на абшарах Расіі паканалі „белых”. У іх правадыроў усялілася жаданне несці „пажар рэвалюцыі” ў Еўропу. Першай на іх шляху паўстала адроджаная Польшча. Напачатку лета назіраецца канцэнтрацыя бальшавіцкіх войскаў на заходнім накірунку. 6 ліпеня іх армады пад камандаваннем камандарма Тухачэўскага пачынаюць наступленне на падраздзелы Войска Польскага. Сілы няроўныя і жаўнеры Пілсудскага паспешна адступаюць. 11 ліпеня захоплены Мінск. 21 ліпеня 3-я армія Лазарэвіча выйшла на рубеж Нёмана. Для расіян стратэгічным важным было авалоданне брадамі праз раку ля мястэчка Масты, бо тое давала аператыўную прастору бальшавіцкім войскам для працягу наступу на Варшаву. Разумелі тое і ў штабе Войска Польскага. Таму самы небяспечны ўчастак фронту было даручана абараняць 1-й беларуска-літоўскай дывізіі пад камандаваннем генерала Жалігоўскага, якая ў большасці складалася з мясцовых добраахвотнікаў, якія не жадалі адступаць далей. 1-я БЛД папярэдне заняла абарону на працягу 70 кіламетраў: ад упадзення Шчары ў Нёман і да вёскі Занеманск. Найболей верагодны ўдар праціўніка меркаваўся ля мястэчка Масты, дзе спрадвеку існавалі гандлёвыя броды, таму на гэтым участку абарону заняў 71-шы Гродзенскі пяхотны полк, які складаўся з добраахвотнікаў.

Бой распачаўся ранкам 22 ліпеня. Напачатку артылерыя чырвоных правяла артпадрыхтоўку. Для карэкціроўкі агню скарыстала паветраныя шары і таму польская артылерыя была падаўлена, былі страты сярод пяхоты. Пасля чаго бальшавікі пачалі фарсіраваць раку праз брады. Насупраць іх у акопах на левым беразе ракі знаходзілася падраздзяленне паручніка Шыманскага. Як толькі чырвонаармейцы дайшлі да сярэдзіны Нёмана, то трапілі пад кулямётны агонь жаўнераў гэтага падраздзялення.

Генерал Люцыян Жалігоўскі — камандуючы 1-й беларуска-літоўскай дывізіяй

Пасля працяглага бою атака непрыяцеля была адбіта. Ён панёс значныя страты. Уніз па цячэнні ракі паплылі дзесяткі цел чырвонаармейцаў. Не атрымалася атака і некалькіх эскадронаў кавалерыі. Сканцэнтраваныя ля могілак на ўсход ад мястэчка яны распачалі фарсіраваць Нёман у конным страі, але сустрэтыя кулямётным агнём у паніцы павярнулі назад. У першы дзень бойкі 6-я дывізія пяхоты саветаў не выканала загаду фарсіраваць раку, пацярпела значныя страты да 300 чалавек забітымі і параненымі. Страты 1 БЛД, галоўным чынам ад артылерыі, склалі 50 чалавек. Аднак левае крыло расійскага войска прарвала польскую абарону над Шчараю. У сувязі з узніклай сітуацыяй Лазарэвіч аддае 21-ай ДП загад на марш пад Пескі — Рось — Воўпу (населеныя пункты ўжо ў тыле беларуска-літоўскай дывізіі).

Расіяне зноў спрабуюць захапіць пазіцыі батальёна паручніка Шыманскага ў ноч з 22 на 23 ліпеня. Калона чырвонаармейцаў без папярэдняй артпадрыхтоўкі пад аховай цемры ўвайшла на брод, але была выкрыта і адбіта.

У новым паядынку артылерыі, які разгарнуўся раніцай, непрыяцель зноў атрымаў перавагу, скарыстаўшы да карэктуры агню паветраныя балоны: падавілі польскую артылерыю, а 1 і 4 роты першага батальёна пацярпелі значныя страты. Былі знішчаны некалькі кулямётаў. Аднак іх хутка замянілі іншай аўтаматычнай зброяй, якую ўзялі з рэзерва. Праз гадзіну ў падраздзяленні Шыманскага было 25 кулямётаў. Каля 10 гадзін раніцы ланцуг чырвонаармейцаў з крыкамі „ўра” ўбег на абодва броды, але тут жа патрапіў пад скрыжаваны кулямётны агонь. Атака захлынулася на сярэдзіне ракі, а пасля гадзіннага бою саветы адступілі па ўсім участку фронту. На паўночным беразе яны патрапілі пад агонь сваёй артылерыі. Да вечара праціўнік не спрабаваў фарсіраваць раку. Апоўдні 24 ліпеня па загадзе генерала Ромера 1-я БЛД з перасцярогі акружэння пачала адыход у накірунку Росі.

Як сведчаць ваенныя гісторыкі зацяты адпор 1-й БЛД Войска Польскага пад Мастамі значна паўплываў на планы расіян. Лазарэвіч змяніў напрамак наступлення 21-й ДП, потым 56-й. Камандзіры суседніх 15-й і 16-й армій павярнулі свае крылавыя падраздзяленні ў зону наступлення 3-й арміі, каб акружыць трымаючых абарону пад Мастамі. Тухачэўскі перадаў Лазарэвічу свой апошні рэзерв — 5 ДП.

1-я БЛД на працягу двух дзён пад Мастамі скоўвала дзве арміі непрыяцеля. Страты расіян былі значныя. Поўнасцю разгромлена калмыцкая (шостая) дывізія, а іншыя на некалькі дзён згубілі баяздольнасць і былі адпраўлены на перафарміраванне.

Шанаванне подзвігу

У 1928 годзе з навакольных вайсковых пахаванняў парэшткі забітых жаўнераў былі перанесены ў брацкую магілу, на тое месца, дзе абарону трымала падраздзяленне Шыманскага, быў пастаўлены помнік у гонар стойкасці і мужнасці жаўнераў 71-га Гродзенскага пяхотнага палка. І ён стаў своеасаблівым сімвалам вайсковай славы. Да самага пачатку другой сусветнай вайны штогод 22 ліпеня тут збіраліся як ветэраны 1-й БЛД, так і жаўнеры Войска Польскага, каб аддаць даніну павагі загінуўшым братам па зброі.

Помнік разбурылі немцы пасля пачатку вайны з СССР. Некуды знік арол, які вяршыў помнік, камень з надпісам быў скінуты ў Нёман. Разам з помнікам знікла памяць пра веліч подзвігу. Брацкая магіла патрапіла ў агарод вясковага чалавека. Як пад плугам сталі з'яўляцца чалавечыя косці, ён запусціў палову агароду.

Спроба аднаўлення памяці

Паколькі гісторыя Савецкай Беларусі пра падзеі той вайны сарамліва маўчыць і ўзгадваем мы пра яе толькі праз Рыжскую дамову, то прыкладна дзесяць гадоў таму пачаў я ўласнае даследаванне, і калі ў большасці паўстала карціна падзеяў тых дзён, накіраваўся я ў Варшаву ў Камітэт загінуўшых, што апякуе пахаванні жаўнераў Войска Польскага па ўсім свеце з мэтаю знайсці паразуменне і падтрымку ў аднаўленні сімвала польска-беларускага вайсковага братэрства. Сустрэча была прыемнай, але скончылася нічым. Такім чынам да мае прапановы аднесліся і мясцовыя ўлады. Адзінае, што з сябрамі змог я зрабіць, падняць камень з Нёмана з надпісам і паставіць на захаваўшыся пастамент.

Вось такі сумны вынік памяці вайсковага подзвігу.

Рэпрэсіі: Расстраляныя беларусы Беласточчыны на Бутаўскім палігоне

Сяргей ЧЫГРЫН

70 гадоў таму пачалася шырокамаштабная акцыя па ажыццяўленню рэпрэсій на Беларусі, Расіі, Украіне і ў іншых дзяржавах, якія ўваходзілі ў СССР. На працягу 1930—1950-х гадоў былі знішчаны мільёны ні ў чым не віноўных людзей розных нацыянальнасцей, у тым ліку сотні тысяч беларусаў.

Нядаўна мне трапіў спіс расстраляных людзей на Бутаўскім палігоне пад Масквою ў 1937—1938-х гадах. Калі я азнаёміўся з гэтым спісам, быў у шоку. Толькі за перыяд з 7 жніўня 1937 года да 19 кастрычніка 1938 года там было расстраляна 20 765 чалавек (спіс гэты кожны месяц папаўняецца). Асноўная частка расстраляных у Бутаве — жыхары Масквы і Маскоўскай вобласці. Але гэта не толькі рускія, а людзі розных нацыянальнасцей, якія ў той час пражывалі недалёка ад Масквы ці ў Маскве і там працавалі. У спісе расстраляных на Бутаўскім палігоне я ўбачыў, што найбольш было расстраляна яўрэяў, беларусаў, палякаў і латышоў. Усіх іх арыштоўвала Камісія НКВД і Пракуратура СССР ды абвінавачвала ў шпіянажы на карысць Польшчы, Германіі і Японіі. З некаторымі прозвішчамі беларусаў Беласточчыны і іншых рэгіёнаў Польшчы, якія былі расстраляны на Бутаўскім палігоне, хочацца пазнаёміць чытачоў „Нівы”. А раптам нехта ўпершыню даведаецца пра трагічны лёс свайго сваяка, суседа, земляка. Ці можа яшчэ жывуць людзі на Беласточчыне ці на Гродзеншчыне, якія ведалі гэтых ахвяр сталінізму, адгукнуцца і мы пра іх даведаемся яшчэ больш: што гэта былі за людзі, як яны трапілі ў Маскву ці Маскоўскую вобласць у 30-я гады XX стагоддзя, якія ў іх былі сем'і і г.д. Вядома, гэты спіс далёка не поўны. Але мы будзем шукаць беларусаў паўсюды, наколькі ў нас хопіць сіл і жыцця. Лёсы нашых суайчыннікаў павінны нас хваляваць заўсёды. Гэта наша гісторыя, гісторыя нашага народа — нялёгкая і трагічная, таму забываць яе нельга. Галоўнае, каб ніколі больш не здарылася тое, што адбылося на Бутаўскім палігоне ў Расіі і на іншых падобных месцах.

Спіс расстраляных беларусаў:

1. Антон Бурс. Нарадзіўся ў вёсцы Навасёлкі Беластоцкага павета ў 1907 годзе. З сялян. Працаваў слесарам на заводзе № 1 імя Авіяхіма Наркамабаронпрама. Жыў у Маскве на вуліцы Пятніцкая. Арыштаваны 5 лістапада 1937 года, расстраляны 4 снежня 1937 года. Рэабілітаваны 15 верасня 1989 года.

2. Сцяпан Андрушкевіч. Нарадзіўся ў мястэчку Лукаў Сядлецкага раёна ў 1884 годзе. Адукацыя вышэйшая. Працаваў начальнікам раённага стралковага ціра. Жыў у Маскве на Вялікай Паштовай вуліцы. Арыштаваны 5 верасня 1937 года, расстраляны 21 кастрычніка 1937 года. Рэабілітаваны 4 верасня 1989 года.

3. Васіль Ануфрынюк. Нарадзіўся ў вёсцы Навасёлкі Бельскага павета

ў 1904 годзе. З сялян, адукацыя сярэдняя, студэнт Педагагічнага інстытута імя Карла Лібкнехта. Жыў у Маскве на вуліцы Стромынка. Арыштаваны 9 лютага 1938 года, расстраляны 8 сакавіка 1938 года. Рэабілітаваны 7 красавіка 1956 года.

4. Сцяпан Банькоўскі. Нарадзіўся ў Беластоку ў 1904 годзе. Адукацыя сярэдняя. Працаваў кансультантам Галоўнага ўпраўлення Наркамхарчпрама СССР. Жыў у Маскве на вуліцы Дамнікоўскай. Арыштаваны 17 лютага 1938 года, расстраляны 11 красавіка 1938 года. Рэабілітаваны 4 кастрычніка 1989 года.

5. Іван Безюк. Нарадзіўся ў г. Ловіч Варшаўскай губерні ў 1902 годзе. Адукацыя вышэйшая. Працаваў начальнікам планавага аддзела Нара-Фамінскай фабрыкі. Жыў у Маскоўскай вобласці ў горадзе Нара-Фамінск на Піянерскім завулку. Арыштаваны 9 лютага 1938 года, расстраляны 28 мая 1938 года. Рэабілітаваны 10 верасня 1957 года.

6. Віктар Бельц. Нарадзіўся ў Плоцку ў 1887 годзе. Адукацыя вышэйшая. Працаваў рэдактарам Ваенвыдавецтва. Жыў у Маскве на Стэльнінскім завулку. Арыштаваны 16 верасня 1937 года, расстраляны 4 снежня 1937 года. Рэабілітаваны 14 верасня 1989 года.

7. Адам Бяльчынскі. Нарадзіўся ў вёсцы Навінка Сувальскай губерні ў 1887 годзе. З рабочых. Кіраваў духавым аркестрам завода „Спецаўтамашына". Жыў у Маскве на завулку Цесляроў. Арыштаваны 10 сакавіка 1938 года. Расстраляны 9 жніўня 1938 года. Рэабілітаваны 22 кастрычніка 1957 года.

8. Мечыслаў Бенашэўскі. Нарадзіўся ў Аўгустове ў 1901 годзе. Адукацыя вышэйшая. Працаваў начальнікам аддзела аўтазавода імя Сталіна. Жыў у Маскве на праспекце Цюфелеў. Арыштаваны 25 кастрычніка 1937 года. Расстраляны 9 снежня 1937 года. Рэабілітаваны 4 красавіка 1957 года.

9. Васіль Герман. Нарадзіўся ў вёсцы Старасельцы Беластоцкага ваяводства ў 1911 годзе. Працаваў гандляром піва піўнага склада МСПО. Жыў у г. Сярпухаў Маскоўскай вобласці на вуліцы Парыжскай Камуны. Арыштаваны 9 верасня 1937 года, расстраляны 2 студзеня 1938 года. Рэабілітаваны 24 лютага 1958 года.

У музеі Бутаўскага палігона

10. Павел Герман — родны брат Васіля Германа. Нарадзіўся ў вёсцы Старасельцы Беластоцкага ваяводства ў 1910 годзе. Працаваў майстрам Інструментальнага завода імя Сольца. Жыў у г. Сярпухаў Маскоўскай вобласці на вуліцы Парыжскай Камуны. Арыштаваны 9 верасня 1937 года, расстраляны 2 студзеня 1938 года. Рэабілітаваны 27 лютага 1958 года.

11. Вольга Горніна. Нарадзілася ў Беластоку ў 1906 годзе. Мела вышэйшую адукацыю, працавала малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута дзяржавы і права. Жыла ў Маскве на вуліцы Горкага. Арыштавана 3 верасня 1937 года, расстраляна 21 кастрычніка 1937 года. Рэабілітавана 19 мая 1956 года.

12. Іван Дубатаў. Нарадзіўся ў вёсцы Тапілец на Беласточчыне ў 1888 годзе. Працаваў дзяжурным у пажарнай ахове. Жыў у вёсцы Орлава Кунцавіцкага раёна Маскоўскай вобласці. Арыштаваны 23 верасня 1937 года, расстраляны 21 кастрычніка 1937 года. Рэабілітаваны 19 сакавіка 1956 года.

13. Аляксей Кайданоўскі. Нарадзіўся ў Аўгустове ў 1903 годзе. Часова нідзе не працаваў. Жыў у Маскоўскай вобласці ў пасёлку Падольскага Цэмзавода, д. 34, кв. 5. Арыштаваны 31 жніўня 1937 года, расстраляны 25 снежня 1937 года. Рэабілітаваны 26 сакавіка 1959 года.

14. Антон Лаўрэнюк. Нарадзіўся ў вёсцы Кожына Бельскага павета ў 1899 годзе. Меў сярэднюю адукацыю. Працаваў намеснікам загадчыка харчовага склада Маскоўскага малочнага завода № 1. Жыў у Маскве на вуліцы Нова-Басманнай. Арыштаваны 15 сакавіка 1938 года, расстраляны 7 чэрвеня 1938 года. Рэабілітаваны 26 верасня 1956 года.

15. Васіль Лазараў. Нарадзіўся ў пасёлку пры станцыі Старасельцы Беластоцкага павета ў 1900 годзе. Працаваў бухгалтарам-рэвізорам ЦК саюза „Севморпуть". Жыў у Маскве на Спірыдонаўскай вуліцы. Арыштаваны 7 лютага 1938 года, расстраляны 28 мая 1938 года. Рэабілітаваны 19 верасня 1957 года.

16. Ульян Сідаровіч (Сідаровіч-Тэадаровіч). Нарадзіўся ў вёсцы Горы Сакольскага павета ў 1887 годзе ў сялянскай сям'і. Працаваў пажарным вартаўніком Шалікоўскага Дзяржхімзавода. Жыў у пасёлку Шалікова Мажайскага раёна Маскоўскай вобласці. Арыштаваны 25 сакавіка 1938 года, расстраляны 16 жніўня 1938 года. Рэабілітаваны 2 кастрычніка 1989 года.

Калі каму нешта вядома пра гэтых людзей, просьба адгукнуцца ці напісаць да нас у „Ніву", а таксама дапоўніць звесткі пра гэтых людзей новымі біяграфічнымі матэрыяламі і фотаздымкамі.

Тут прайшла ваенушка

Успаміны Ірэны ТАЛОЧКА з Паўлінова, народжанай у 1930 годзе.

Пры санацыі вучылася я адзін год у школе ў Вульцы-Выганоўскай. У той час школа, якая стаіць па сённяшні дзень, была ўжо пабудавана, толькі была без аддзелкі. Вучні вучыліся ў прыватных хатах. Настаўнічала пані Крулёва, па-польску.

Пры саветах вучылася я таксама год. Тады сталі настаўнічаць прысланыя з усходу Лізавета і Таня. Вучылі яны па-руску, было і па-беларуску. Помню я яшчэ вершык з таго часу:

І што ж цяпер будзе?
Гадае Пятрок,
Яму ж ужо стукнуў
Дзевяты гадок.
Пара бы вучыцца,
Ды школы няма,
А панскія школы
Не вучаць дарма.
Няма ў што адзецца,
Плаціць няма чым.
І кружацца мыслі,
Як мухі над ім.

Саветы хацелі арганізаваць у нас калгасы, але людзі бараніліся і так тады ўдалося абараніцца перад гэтым. Але раскулачвалі і на Сібір вывозілі. З нашай вёскі аднаго вывезлі, кавалера, бо не здаваў ім паставак. Было ў яго дванаццаць ці шаснаццаць штук быдла і калі яны прыязджалі забіраць, то з дубінкай ад іх бараніўся. І ён ужо з Сібіры не вярнуўся. І з Вулькі-Выганоўскай аднаго вывезлі, яго ў Брэст давезлі, а там ужо немцы вызвалілі. То ён пасля немцам выслугоўваўся, а калі саветы сюды вярнуліся, дык ён выехаў недзе на захад.

Пры немцах таксама спачатку школа была, у якой сталі вучыць па-нямецку. Я так навучылася лічыць да дваццаці. Спачатку адзін з Вулькі-Выганоўскай вучыў і з вёсак, а пасля дадалі нямецкую мову і гаварылі, што яе жыд навучаў. Але пасля года дзеці не пайшлі ў тую школу, навучанне не было абавязкам і так тая нямецкая школа раскідалася і ўжо ніхто не вучыў.

Пасля вайны у Паўлінове арганізавалі курсы тым, што школы не мелі, каб давучваліся, але я ўжо на тыя курсы не хадзіла.

Немцы забіралі моладзь на працу ў Германію; з нашай вёскі забралі ўсяго пяць асоб — усе яны вярнуліся. А мы тут асталіся. Мой тата ад немцаў тут загінуў.

У нашу вёску немец бежанцаў прывёў, дзве сям'і: адну з Белавежы, а другую з Клепачоў. Тых з Клепачоў нехта выпатрабаваў і яны неўзабаве выехалі ад нас. А белавежскія год ці два працавалі ў мясцовым панскім двары, а пасля немец забраў іх да работы ў Кляшчэлі — у свінарню і ў млын.

Нашых падлеткаў немец выганяў пад Сухавольцы камяні збіраць на брук, а старэйшых — старажаваць чыгунку, каб партызаны не ўзарвалі. Хадзілі па двух чалавек з вёскі, вартавалі днямі і начамі.

Як саветы немцаў гналі, то наша вёска тры разы загаралася, але за кожным разам людзі гасілі. А Чахі-Забалотныя згарэлі: у Паўлінове ў панскіх бараках адзінаццаць сем'яў з Чахоў пасля тых пажараў пасялілася. Снарады рваліся ў вёсцы, немцы пад Красным Сялом бараніліся, а саветы на Малочкі наступалі, многа іх тут загінула — між Вулькай-Выганоўскай і Паўліновам.

Мы пад клуню схаваліся і бачым, што саветы наш воз забіраюць. Мама нас, дзяцей, на той воз пасадзіла і ў плач. А салдат кажа ёй: як мы не забярэм, то іншыя забяруць. І сказаў нам схаваць той воз. То мы яго ў траву зацягнулі, на лонку.

Пасля мы яшчэ два тыдні на лонках сядзелі. У балоце кароў трымалі, малако на месцы было. А як хлеб у хатах падыходзіў, то жанчыны беглі дахаты і такі там хлеб выходзіў. І на плахтах спалі, бо ж калісь не было ні коўдраў, ні пасцелі лепшай.

Салдаты акопаў накапалі, адзін з вяскоўцаў забег у такі акоп, сеў і закурыў. Бег салдат, убачыў яго і накрычаў:

— Хто тут курыць! Не бачыш, што самалёты лётаюць?

І як коні байцам прыставалі, то яны тых сваіх коней кідалі і лавілі нашых, гаспадарскіх, і з вазамі забіралі. Я свайго каня схапіла, трымаю яго, а салдат кажа: працяг ☞ IV

Вакол вайны

Бацька многа часу ў лесе працаваў, камяні на аэрадром пад Заблудавам збіраў, падаткі вялікія былі. Вывозілі людзей у Сібір, і нас вызначылі на 29 чэрвеня. Яшчэ ў пятніцу, да вайны, аднаго на Енісей вывезлі...


Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Павел Грэсь

Успаміны Паўла Грэся з Валіл, народжанага ў 1928 годзе.

Дзед мой расказваў пра паўстанцаў з 1863 года, што яны хадзілі і грабілі. Свае гнёзды ў шляхты мелі, дзе балі спраўлялі. Казакі дзеду загадалі, каб іх вёў, а фурман салому кідаў, каб не заблудзіць. Завёў іх у Радулін, а там яны 46 чалавек перарубалі, а рэшта ўцякла. Казакі яшчэ Каралеўскае Стойла спалілі.

Мой бацька ў 1913-21 гадах у рускім войску служыў, спачатку ў царскай арміі, а пасля ў бальшавіцкай. Быў ён інтэндантам у штабе Дзяржынскага. Спярша служыў у Царыцыне, а пасля ў Маскве. Дзед стаў петыцыі пісаць, каб вяртаўся дахаты і бацька вярнуўся, але злосны быў, бо ўжо быў лейтэнанта даслужыўся. На Тамбоўшчыне, дзе нашы былі ў бежанстве, народ добры быў, але гуляшчы. Дзед рускіх не любіў, хаця яго зяць бацюшкам быў.

У Стоўбцах палякі цікавіліся, чаго мы ў Польшчу едзем. І тут ужо ўстанавілі за нашымі паліцыйны нагляд. Першы год трэба было з'яўляцца на паліцыйны пастарунак раз у тыдзень, а другі год — раз на два тыдні.

У верасні 1939 года прыехалі ў нашу вёску савецкія ваякі на англійскім матацыкле „ВСА". І да мяне:

— Здравствуй, пацан. Это ваш дом? — пытае.

А ў нашай хаце фіранкі былі, ганак, памаляваныя вокны. Пабачылі бацьку і пытаюць:

— А кто это там?

— Бацька мой.

Пайшлі, прывіталіся, штаб тут хочуць размясціць. Навалілася войска, маёр, дзве кабеты: лекарка і медсястра. Вечарам кормім свіней, а маёр пытае бацьку:

— Хозяин, а сколько у тебя слугов?

— А этот, — бацька паказаў мяне, — і жонка яшчэ.

Пераначавалі ў нас дзве ночы і паехалі далей.

Пайшоў я ў школу. І добра мне ішло, любіў спяваць. Яшчэ вясной 1939 года заспяваў я песню „Если завтра война", дык настаўнік быў кінуўся на мяне. А я ў той час гэтую песню пачуў па радыё, што адзін у нас меў. І „Кацюшу" таксама ўмеў спяваць.

Вучыла нас настаўніца Ніна Кісель са Смаленшчыны. Прыехаў у нашу школу візітатар, глядзіць бюлетэні, а ў мяне з паводзін тройка. Пытае настаўніцу:

— Который это?

— Этот.

— Не должен он такой быть, — сказаў.

Дырэктар не хацеў мяне да экзамену дапусціць, а візітатар кажа:

— Он исправится.

Бо ў мяне былі добрыя ацэнкі.

У 1940 годзе на папоўскай дачы, што на Станцыі была, стала НКВД. І тое войска непрыхільнае да нас было. У нас калгас саветы зрабілі. Нас лічылі кулакамі, але *одиноличников* больш было, нават у калгасе. Бацька многа часу ў лесе працаваў, камяні на аэрадром пад Заблудавам збіраў, падаткі вялікія былі. Вывозілі людзей у Сібір, і нас вызначылі на 29 чэрвеня. Яшчэ ў пятніцу, да вайны, аднаго на Енісей вывезлі; пасля ён з касцюшкоўцамі вярнуўся. А немцы, як пасля насталі, удвая горшыя былі...

У 1939 годзе немцы дайшлі да Гарадка, вясёлыя былі. Вечарам дзядзька чатырох немцаў да сябе запрасіў, выпілі, заспявалі. І двое сутак тады ў нас яны стаялі. А ўжо ў 1941 годзе злосныя былі, страшныя. Гаварылі:

— Za dwa tygodnie będzie Moskau. Stalin kaputt!

Саветы тады ўцякалі самапас, без ніякага камандавання. Вайна пачалася ў нядзелю, а немцы тут ужо ў пятніцу былі. Пастух авечак з пашы вечарам гнаў, пусціў у вуліцу, яны пыл паднялі. А нямецкі лётчык пабачыў гэты пыл, падумаў, што столькі войска ідзе і бомбу на нашу вуліцу кінуў. Таму хлопцу, што авечак гнаў, адарвала галаву, бомба параніла яшчэ адну дзяўчыну, нагу ёй вырвала і яна выкрывавілася. І цэлая вуліца авечак набітая была; пасля дзве фуры авечак у ямы для бульбы вывезлі і закапалі.

Пасля тры савецкія танкі ехалі, паехалі па полі і ў торф заселі, дулам у балота. Але пашчапляліся і неяк павыцягаліся і паехалі далей. Але саветы пакінулі многа ўсялякага жалества: машын, танкаў, трактароў, гармат. Пасля ўсё гэта немцы збіралі і на станцыі мо з паўгектара саміх гармат стаяла. І быў загад усялякае ружжо солтысу здаваць.

Партызаны ўжо ў 1941 годзе сталі збірацца. Аднойчы вечарам прыходзяць да нас трох ці чатырох і да бацькі:

— Дзе сын?

— Спіць.

— Абудзі яго.

— Помніш, — пытаюць мяне, — дзе вінтоўку ў рэчку кінуў? Вядзі!

Быў лістапад, стаяў туман, холадна. Завёў я іх на ямку і кажу:

— Здесь.

Адзін распрануўся і ў ваду скочыў. Вылазіць...

— Нет, — кажа.

І яшчэ раз нырнуў, выцягае вінтоўку. І мне кажуць:

— Пошёл домой! Только молчи, никому не говори.

А пра гэта людзі даказалі, што мы гулялі, гулялі гэтай вінтоўкай і пасля ў рэчку яе выкінулі.

У сакавіку 1943 года былі мы пад Пяшчанікамі, там грабавіска было, дзе жывёлу хатнюю закопвалі. Аж бачу — ківае да мяне пальцам: „Хадзі!" Я падышоў, а там мо з дзесяць чалавек сядзела. Адзін пытае мяне:

— А там кто?

— Ацец.

— Пазаві!

Спісалі нас і загадалі зараз адтуль забірацца.

Калі гарэла Папоўка, а было гэта на Яна, мы былі за рэчкаю на ягадах. Ідзем з лесу, бачым — пажар; мы падумалі, што лес гарыць. І як прыйшлі ў вёску, нам сказалі, што Папоўку спалілі.

У Папоўцы было многа нашых сваякоў, м.інш. бацькава дваюрадная сястра; ейнае дзіця немцы жывым у яму кінулі. У сваякоў такія добрыя і прыгожыя дзеці былі... Ліза з акна ў маліннік скочыла, немец гэта бачыў, сказаў прысесці, а пасля каб уцякала... Там Грасі і Дзянісікі жылі. Пабілі іх у Гарадку, на жыдоўскіх могілках, а перапахавалі ў 1944 годзе. Наш дзядзька тады скрыню збіў, каб тых пабітых з Папоўкі перапахаваць. Гэта партызаны згубілі вёску. А былі тыя рускія і ў Дзернякове, і ў Пяшчаніках. А Бівойна выдаў і Папоўку, і Лазні, і Засады.

Як наступалі саветы, паставілі ў нас нейкі штаб і праз два тыдні ў хату нельга было ўвайсці; мы тады ў Радуліне жылі. Усіх выгналі, кругом паставілі пастарункі і толькі ход да калодзежа вызначылі. А як у Варшаве ўспыхнула паўстанне, то гаварылі:

— Пусть повоюют поляки, посмотрим.

У 1945-47-м хадзілі сённяшнія „камбатанты". Раз я вечарам стаяў і амаль мяне не застрэлілі: дай ім тое, чаго не маеш і не знаеш; хацелі даваенных польскіх мундзіраў. Сярод іх быў адзін такі, што ў савецкай контрразведцы раней працаваў. Пасля засудзілі яго на трынаццаць гадоў турмы, як на вяселлі падстрэлілі і злавілі.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

III ☞ працяг

Тут прайшла ваенушка

— Девочка, зачем ты его держишь? Мы и так его не возьмём.

Мы рускіх не баяліся так як немцаў — што заб'юць. Спадзяваліся адно толькі, што накрычаць.

Пасля вайны сталі ў нас калгасы арганізаваць. Парабілі ў Вульцы-Выгаеўскай і Москаўцах. І ў нас быў на паперы, але на працу ў той калгас людзі не выходзілі.

Прыязджалі агітатары і моцна намаўлялі нашых сялян, каб у Савецкі Саюз выязджалі. А мама мая сказала:

— Тут прайшла ваенушка, а ў Расіі вайна кіпела.

І мы не паехалі. З нашай вёскі толькі адну ўдаву з пяцёркай дзяцей агітатары намовілі выехаць, яна нам сваю хату прадала. І яшчэ ад нас адзін паехаў. Ён раней, як саветы адступілі і людзі пабралі пакінутае імі дабро, хадзіў і адбіраў тое людзям. А з Чахоў, што ў вайну згарэлі, выехала, бадай, пяць сем'яў, у тым ліку і сваякі майго мужа.

Спярша іх далёка вывезлі, але пасля ім удалося пераехаць бліжэй. Яны зажылі там так, што найгоршаму ворагу не пажадаць. Убівалі цвікі ў кій і па начах хадзілі па полі і тым цвіком бульбу выбіралі: калі цвік на камень трапіць, то не возьме, а бульбу — так. Як мы да іх паехалі, то я плакала, гаварыла:

— Дзядзьку, а чаго ж вы туды выязджалі?

Бо там, трыццаць гадоў пасля вайны, было так, як у нас яшчэ пры санацыі.

А ў нас, недзе ў 1950-х гадах, правялі меліярацыю на сенажацях. Лазнякі выкарчоўвалі і фурманкамі вывозілі, аралі дэтамі, равы капалі. Бо да таго часу сена на дзверы клалі і канатамі выцягалі, такое там балота было.

Дзяцей вывучылі, хаця цяжка было. Адзін наш сваяк хадзіў да настаўніцы, мела быць ужо вяселле, але раскідалася. То тады ўсе настаўнікі сталі нашым сынам дрэнныя ацэнкі выстаўляць, двойкі і двойкі. А можа яны хацелі хабараў, а мы не мелі з чаго даваць?.. Але аднаму настаўніку трэба было выкапаць студню, а мой муж умеў гэта рабіць. І як тую студню выкапаў, то і двойкі ў сыноў прапалі.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ